ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 57 (2110)
15 ліпеня 1966 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У НЯДЗЕЛЮ—ДЗЕНЬ МЕТАЛУРГА

ЛЮДЗІ ВОГНЕННАЙ ПРАФЕСІІ

Сталь пайшла... Не, нават слова не тое «пайшла» — хлынула вогненным патокам. Залацістым дажджом сыпанулі іскры, зайгралі водбліскі на ўспатнелым твары сталявара. У яго гэта мінуты высокага напружання і ў той жа час душэўнай радасці — вось ён, метал, здабытак тваёй рупнай працы!

Колькі такіх вось напружаных момантаў было ў сталявара Мінскага трактарнага завода Георгія Шашко! Вось ужо трынаццаць гадоў працуе ён у сталеліцейным цэху — з дня яго адкрыцця. Шмат тысяч тон сталі за гэты час пацяклі вогненнымі патокамі з электрапечы Шашко, уліваючыся маленькімі ручайкамі ў магутную раку савецкай металургіі.

Перадавы металург трактарнага завода штогод нарошчвае тэмпы. Сёлета ён абавязаўся даць 600 тон высакаякаснай сталі звыш плана. І словы яго не разыходзяцца са справай. За мінулае паўгоддзе Георгій Шашко даў 315 тон сталі звыш нормы.

«Выканаем пяцігодку за чатыры гады», — першымі сказалі на трактарным сталявары Георгій Шашко, Андрэй Бялко і Аляксандр Азараў. «Мы — таксама», — падтрымалі іх многія металургі аўтамабільнага завода. Так загарэўся агонь сацыялістычнага спаборніцтва.

Георгій Шашко — адзін з радавых дзвюхмільённай арміі металургаў нашай краіны. Яна, гэта магутная армія, дамаглася таго, што Савецкі Саюз займае другое месца ў свеце па вытворчасці сталі і пракату, упэўнена набірае яшчэ большы разгон.

У надыходзячую нядзелю — Дзень металурга. Са святам вас, дарагія сябры!

БУДНІ МАСТАКОЎ

ПРА ГЕРАІЧНАЕ

Над чым працуюць цяпер брэсцкія мастакі? З такім пытаннем наш карэспандэнт звярнуўся да ўпаўнаважанага Саюза мастакоў пры Брэсцкіх мастацкіх майстэрнях Аляксея Ягоравіча Шмакава. Вось што ён паведаміў:

— Амаль усе нашы мастакі працуюць над творамі, прысвечанымі 50-годдзю Савецкай улады. Асабліва хвалюе іх тэма героікі, тэма велічы савецкага чалавека. Так, мастак Мікалай Чураба працуе над трыпціхам «Бессмяротнасць» — пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

Жахі фашысцкіх канцэнтрацыйных лагераў, нязломную волю савецкага чалавека хвалююча перадае ў сваіх творах наш мастак Эдуард Куско. Яго ранейшыя работы на гэту тэму «Праўда», «Не забудзем» былі высока ацэнены на рэспубліканскіх выстаўках. І цяпер Эдуард Куско працягвае работу над гэтай хвалюючай тэмай.

«На зямлі Люблянскай» — так назваў сваю будучую карціну мастак І. Рудчык. Ён уваскрашае на палатне ўсё перажытае, выпакутаванае самім у суровыя гады вайны.

МОВАЮ ПЛАКАТА

Шэраг маляўнічых плакатаў, прысвечаных 50-годдзю Савецкай улады і 100-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна, рыхтуе да выпуску Дзяржаўнае выдавецтва «Беларусь».

Мастак Л. Замах працуе над плакатам пад умоўнай назвай «Беларусь». У сімвалічным вобразе беларускай жанчыны ён хоча паказаць прыгажосць і веліч нашай рэспублікі.

Цікавы па задуме плакат Ю. Булычова, які будзе адлюстроўваць індустрыяльны рост Беларусі за гады Савецкай улады. Вершаваны подпіс пад гэты плакат зрабіў паэт Анатоль Вялюгін.

Над плакатамі працуюць і іншыя мастакі. Да слаўнага юбілею выдавецтва выпусціць таксама каляровыя паштоўкі.

З ЗАВОДСКІМ ПРОПУСКАМ

Многія будаўнікі, рабочыя Гродзенскага азотнатукавага завода добра ведаюць мастака Міхаіла Антонавіча Плужніка. Ён часта прыходзіць на будаўнічыя пляцоўкі з мальбертам. Аб тым, што М. Плужнік на будоўлі не часовы госць, сведчыць і пастаянны заводскі пропуск, які ён заўсёды паказвае ў прахадной.

Шмат чаго цікавага ўбачыў ужо гродзенскі мастак на вялікай новабудоўлі хіміі. Ён зрабіў тут многа накідаў, эскізаў. Але гэта пакуль яшчэ пачатак вялікай работы — палатна «Гродзенскі азотнатукавы», якое Міхаіл Антонавіч мяркуе скончыць да 50-годдзя Савецкай улады.

МАЙСТАР АКВАРЭЛІ

У выставачнай зале Віцебска адкрыта выстаўка акварэлей старэйшага беларускага мастака Льва Маркавіча Лейтмана. Каля двухсот твораў экспануецца на ёй.

З творчасцю Л. Лейтмана віцябляне знаёмы здаўна. Яшчэ ў трыццатыя гады ён выкладаў у Віцебскім мастацкім тэхнікуме, выхаваў нямала здольных маладых мастакоў.

Віцябляне з цікавасцю знаёмяцца з новымі творамі свайго земляка.

Ю. ДОКТАРАЎ.

У ДАЛЁКАЕ ЗАПАЛЯР'Е

Плённа працуюць сёлета гомельскія майстры жывапісу і графікі. Мастак В. Казачэнка піша індустрыяльныя пейзажы Светлагорска, Наваполацка, Гомельскага суперфасфатнага завода. Яўген і Любоў Пакаташкіны працягваюць работу над серыяй гравюр, таксама прысвечаных новабудоўлям Беларусі. На палотны А. Васільева кладуцца фарбы роднай беларускай прыроды...

А вось мастакоў Д. Аленіка, М. Казакевіча і В. Крылова захапіла рамантыка далёкага паўночнага — у Запаляр'е. Там яны будуць пісаць пейзажы суровай Поўначы.

ПЕЙЗАЖЫ Анатоля Сяліцкага

У блакітнай смузе ранішняга паветра за соснамі і бярозкамі праглядваюць сілуэты гарадскіх будынкаў. Здаецца, толькі перайдзі палескую рачулку — і ты апынешся там, дзе адступілі балоты перад чалавекам, які стварыў гэтыя прыгожыя дамы. Трапяткая белізна воблакаў у блакіце неба быццам падкрэслівае агульны светлы настрой пейзажу.

Так успрымаеш карціну Анатоля Сяліцкага «Раніца», напісаную ім сёлета. Гэты пайзаж, як і кампазіцыя «Раніца майго горада», прысвечаны роднаму Пінску.

Шэраг яго эцюдаў і карціна «Піна працоўная» адлюстроўваюць працу рачнікоў. Анатолю Сяліцкаму па душы індустрыяльны пейзаж горада — панарама суднабудаўнічага завода, багацце новай магутнай тэхнікі.

Калі знаёмішся з такімі работамі мастака, як «Перад навальніцай. Пінск», «Піна», «Вясна на Палессі», «Палескія разлівы», — пераконваешся, што ён умее бачыць непаўторную прыгажосць роднага краю. Яна ажывае і ў работах «Ранняй вясной», «Сакавіцкі дзень», «Летні вечар», «Стагі», «Бярозавы гай увосень», «Першы снег», «Лютаўскі вечар», «Зіма».

Анатоль Сяліцкі — ураджэнец Пінска, выхаванец Віцебскага мастацкага вучылішча. Цяпер ён працуе выкладчыкам у сярэдняй школе № 2 горада Пінска. Сёлета землякі пазнаёміліся з вялікай выстаўкай яго работ, створаных за чатыры гады напружанай працы. Усяго на гэтай выстаўцы, наладжанай Пінскай карцінай галерэяй, экспанавалася каля шасцідзесяці эцюдаў, пейзажаў, карцін-пейзажаў.

Трэба адзначыць, што ў работах, якія аўтар лічыць завершанымі карцінамі, не-не ды і адчуваецца эцюднасць. Але мастак працуе многа, напружана, імкнецца пераадолець гэты істотны недахоп сваіх палоцен.

Мы часта сустракаем А. Сяліцкага з мальбертам то на гарадской вуліцы, то на беразе рэчкі, то на заводской пляцоўцы. Нараджаюцца новыя палотны мастака, улюбёнага ў свой горад.

Ул. БАРАВІКОЎ.

Пінск.

Відаць, многім аматарам мастацтва добра запомнілася карціна І. Стасевіча «У беларускіх балотах» — яго дыпломная работа. Аўтар уваскрасіў на палатне свае партызанскія ўспаміны. І яны сталі рэальнымі вобразамі, яркімі, запамінальнымі. Гэтай карцінай мастак сказаў сваё творчае «я». Потым новыя і новыя творы мастака.

І. Стасевіч — у дарозе, у пошуках. Вось і цяпер у яго новыя цікавыя задумы. Пра іх пакуль асабліва не хоча гаварыць мастак. Ён думае напісаць карціну на рэвалюцыйную тэму, а таксама на тэму Вялікай Айчыннай вайны. На палатно кладуцца ўсё новыя і новыя штрыхі, сціраюцца, зноў наносяцца спрактыкаваная рукой.

Фота Ул. КРУКА.

НА НАРАЧАНСКІМ СЕМІНАРЫ

Рэспубліканскі семінар творчай моладзі на беразе сіняй Нарачы працягвае сваю работу.

У мінулым нумары газеты мы пісалі, што 11 ліпеня на семінары быў дзень кіно. Пачаўся гэты дзень не так, як папярэднія: творчая дыскусія, абмен думкамі быў адкладзены напасля, а напачатку ўдзельнікі семінара прагледзелі новыя работы маладых рэжысёраў-пастаноўшчыкаў студыі «Беларусьфільм». Былі паказаны кінафільмы «Я родам з дзяцінства» рэжысёра В. Турава—пра дзяцінства, апаленае вайной, «Пастка» Л. Мартынюка (па матывах аднайменнай аповесці В. Быкава) і «Шчырая размова» рэжысёра М. Хубава. Раней творчая моладзь прагледзела кінафільм рэжысёра І. Дабралюбава «Іду шукаць».

Пасля прагляду гэтых новых работ маладых беларускіх кінарэжысёраў пачалася творчая гаворка. Кіраваў пасяджэннем старшыня Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў БССР Б. У. Паўлёнак. З гутаркай аб развіцці беларускага кінамастацтва выступіў кіраўнік маладзёжнага творчага аб'яднання кінастудыі «Беларусьфільм» С. К. Скварцоў. У спрэчках прынялі ўдзел многія маладыя рэжысёры, літаратары, кампазітары, мастакі, артысты. Усе яны адзначылі, што ў беларускае кіно ідзе здольная моладзь, якая мае свой адметны почырк і сваю манеру. Гаворка, пачатая абмеркаваннем фільмаў «Іду шукаць», «Я родам з дзяцінства», «Пастка» і «Шчырая размова», выйшла за рамкі размовы толькі аб гэтых кінафільмах. Удзельнікі семінара абмяняліся думкамі аб праблемах і галоўных кірунках развіцця нашага нацыянальнага кінамастацтва, аб пошуках новых прыёмаў і сродкаў адлюстравання нашай рэчаіснасці на экране, аб стварэнні ў кіно вобраза маладога сучасніка. Многа ўвагі ўдзельнікі гэтай дыскусіі аддалі праблеме кінасцэнарыяў, перш за ўсё арыгінальных літаратурных сцэнарыяў, — найбольш вострай, па ўсеагульнаму прызнанню, праблеме, з якой сутыкаецца беларускае кінамастацтва.

Увечары гэтага ж дня творчая моладзь сустрэлася з сакратаром ЦК КПБ С. А. Пілатовічам і першым сакратаром ЦК ЛКСМБ Г. М. Жабінскім.

Наступныя два дні—12 і 13 ліпеня—удзельнікі семінара правялі ў паходах па партызанскіх сцежках Нарачанскага краю. Пачаўся ён ад маляўнічага берагу Нарачы, на якім узвышаецца велічны абеліск у памяць загінуўшых народных мсціўцаў і мірных грамадзян у гады Вялікай Айчыннай вайны. Усклаўшы да падножжа абеліска яркія букеты палявых і лугавых кветак, удзельнікі семінара падзяліліся на дзве групы і накіраваліся да месца былой партызанскай базы. Групы вялі былыя партызаны, ветэраны вайны М. П. Лук'янец і С. Д. Дзмітрачонак. Моладзь агледзела рэшткі былых партызанскіх землянак, пастаяла ў маўчанні на месцы былых партызанскіх могілак, вечарам ля кастра слухала ўспаміны былых народных мсціўцаў, спявала песні аб былых нягодах і начных паходах...

Вярнуўшыся 13 ліпеня з турысцкага паходу, удзельнікі семінара сустрэліся ўвечары з намеснікам старшыні Беларускага рэспубліканскага савета ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны генерал-лейтэнантам І. С. Жыгаравым, з былым начальнікам Беларускага штаба партызанскага руху П. З. Калініным і з былым камандзірам партызанскай брыгады імя Ракасоўскага А. В. Раманавым. І. С. Жыгараў расказаў моладзі аб сваіх франтавых дарогах, аб удзеле ў вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; П. З. Калінін і А. В. Раманаў падзяліліся з удзельнікамі семінара ўспамінамі аб партызанскіх буднях, расказалі пра былых сваіх баявых сяброў і паплечнікаў.

Учора на семінары быў дзень музыкі. Уступнае слова сказаў на семінары малады кампазітар Д. Смольскі. А пасля гучалі новыя творы нашай музычнай моладзі.

Сёння — апошні дзень работы семінара. Прысвечаны ён тэме «Камсамол і творчая моладзь».

У ГОНАР СЛАЎНАГА ЮБІЛЕЮ

11 ліпеня ў Мінску адбылося пасяджэнне рэспубліканскага аргкамітэта па правядзенню фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады. Заслуханы інфармацыі прадстаўнікоў абласных і Мінскага гарадскога аргкамітэтаў аб ходзе падрыхтоўкі да фестывалю. З імі выступілі старшыня Магілёўскага абласнога аргкамітэта, намеснік старшыні аблвыканкома В. А. Дайнека, старшыня Мінскага гарадскога аргкамітэта, намеснік старшыні выканкома гарсавета А. І. Канцавая, начальнік Віцебскага абласнога ўпраўлення культуры Г. І. Карыпалава, начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры М. П. Шаўчук, намеснікі начальнікаў абласных упраўленняў культуры: Гомельскага — Д. П. Мурзо, Гродзенскага—В. С. Курута, Мінскага—В. Н. Бобрыкаў, дырэктар рэспубліканскага Дома народнай творчасці А. Н. Талчынская.

Аргкамітэт заслухаў таксама інфармацыю намесніка міністра культуры БССР Р. Г. Мачуліна аб мерапрыемствах творчых саюзаў рэспублікі ў сувязі з правядзеннем фестывалю.

Фестываль будзе праводзіцца ў некалькі этапаў. Да канца сёлетняга года пройдуць агляды ў калгасах, саўгасах, на прадпрыемствах, у навучальных установах, установах, у гарадах і раёнах. У лютым — сакавіку 1967 года адбудуцца фестывалі ў абласных цэнтрах і ў горадзе Мінску.

З 20 сакавіка па 2 красавіка 1967 года ў сталіцы рэспублікі пройдзе агляд тэатральных самадзейных калектываў. А з 23 па 29 чэрвеня — справаздачныя канцэрты абласцей.

У маі 1967 года ў Мінску будзе адкрыта выстаўка самадзейнага выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У чэрвені намячаецца правесці агляд аматарскіх кінафільмаў.

У сакавіку 1967 года адкрыецца выстаўка дзіцячай тэхнічнай творчасці, а ў ліпені адбудзецца Дэкада мастацкай самадзейнасці школьнікаў.

Лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці, выканаўцы, кінааматары, народныя ўмельцы прымуць удзел ва ўсесаюзных тэатральнай і музычнай дэкадах, выстаўцы твораў выяўленчага і прыкладнога самадзейнага мастацтва, конкурсе аматарскіх фільмаў у Маскве.

Як адзначалася на пасяджэнні, на месцах разгарнулася значная работа па падрыхтоўцы да фестывалю самадзейнага мастацтва. Створаны сотні новых самадзейных калектываў. У многіх месцах да знамянальнай даты будуюцца клубныя памяшканні. Так, у Брэсцкай вобласці ўзводзіцца 100 новых клубаў, а ў Мінскай — 177. Мясцовыя Саветы, калгасы, саўгасы, прадпрыемствы і арганізацыі прыступаюць да падрыхтоўкі дамоў і палацаў культуры, клубаў і іншых культасветустаноў да фестывалю і да работы ў асенне-зімовых умовах. Вялікая работа праводзіцца па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, абнаўленню рэпертуару.

Важныя мерапрыемствы праводзяць творчыя саюзы. Саюз мастакоў БССР стварыў спецыяльную камісію па аказанню практычнай дапамогі самадзейным майстрам, а таксама народным тэатрам і драматычным калектывам у афармленні фестывальных спектакляў. Кампазітары БССР падрыхтавалі да фестывалю дзесяць песень. Кампазітар Ю. Семяняка памагае Ашмянскаму народнаму тэатру ў пастаноўцы сваёй аперэты «Рабінавыя каралі». Дзейсную дапамогу самадзейным калектывам аказваюць кампазітар Д. А. Лукас, мастацкія кіраўнікі прафесіянальных творчых калектываў народны артыст СССР Р. Р. Шырма, народны артыст БССР Г. І. Цітовіч, заслужаны артыст БССР А. Г. Апанасенка.

Беларускае тэатральнае таварыства таксама вылучыла спецыяльную групу для аказання дапамогі самадзейным калектывам. Майстры сцэны ўзялі шэфства над радам народных тэатраў і драмгурткоў.

Рэспубліканскім Домам народнай творчасці падрыхтаваны рэкамендацыйны анатаваны спіс твораў усіх жанраў для выкарыстання ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Падрыхтаваны зборнік песень самадзейных кампазітараў.

Саюз кінематаграфіі БССР правёў семінар кінааматараў, арганізаваў прагляд і абмеркаванне іх работ. Добрую ініцыятыву праявілі Мінская і абласныя тэлевізійныя студыі, якія арганізавалі ў сувязі з падрыхтоўкай да фестывалю тэлешколы і кансультацыі, перадачы пра самадзейныя калектывы. Новыя творы для мастацкай самадзейнасці рыхтуюць беларускія пісьменнікі.

Па абмеркаваных пытаннях аргкамітэт прыняў рашэнне.

БЕЛТА.

ВЫХАВАННЕ ПАЧУЦЦЯЎ

НАТАТКІ З III РЭСПУБЛІКАНСКАГА АГЛЯДУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ

Гэтыя радкі — не рэцэнзія на канцэрты, якія я як член журы III рэспубліканскага агляду мастацкай самадзейнасці школьнікаў уважліва глядзеў і слухаў на працягу васьмі дзён. Мне проста хочацца падзяліцца некаторымі думкамі, якія ўзніклі ў мяне ў сувязі з аглядам.

Кожная новая сустрэча са школьнай самадзейнасцю — гэта заўсёды радасная падзея. І не толькі таму, што нас, дарослых, цешыць і захапляе шчырасць, непасрэднасць выступленняў дзяцей. У кожным новым аглядзе з радасцю заўважаеш новыя якасці. Я бачу, як растуць і сталеюць нашы юныя таленты, як усё больш дзяцей уцягваецца ў самадзейныя гурткі, як пад умелаю рукою педагога-музыканта выхоўваюцца ў школьнікаў добрыя густы.

Трэці рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці школьнікаў яскрава падкрэсліў гэтыя новыя рысы і напрамак у эстэтычным выхаванні дзяцей. Гэтым я не хачу сказаць, што ў выхаванні ў школьнікаў высокіх мастацкіх густаў, любві да мастацтва мы ўжо зрабілі ўсё, і нам няма больш чым займацца. Сцвярджаць такое сёння, на жаль, яшчэ рана, ды і наогул няма мяжы добраму, яно заўсёды ў развіцці і станаўленні.

І яшчэ на адну акалічнасць хацелася б звярнуць увагу. Крыштальна чысты рэпертуар школьнай мастацкай самадзейнасці ў ідэйных адносінах. Пераважалі творы аб Леніне, партыі, Радзіме, нашым народзе і яго гераічным мінулым, творы, прысвечаныя савецкім дзецям — іх вучобе, адпачынку.

Парадавала таксама разнастайнасць жанраў. Выступалі хоры, вакальныя ансамблі, салісты, дуэты, танцавальныя калектывы, аркестры — духавыя, зборных народных інструментаў, адзін цымбальны, ансамблі баяністаў і скрыпачоў, былі і мастацкае чытанне, і цыркавыя і эстрадныя нумары. Кіраўнікі калектываў цяпер больш патрабавальна ставяцца да сваёй работы.

Усё сваё жыццё я звязаў з песняй і таму ў гэтым артыкуле буду больш гаварыць пра песню-чараўніцу, якая выхоўвае душы людскія. Сапраўды, хто з дзяцей не любіць спяваць, танцаваць. Спяваюць (асабліва школьнікі малодшых класаў) літаральна ўсе, іншая справа, як іх вучаць спяваць. Натуральнае імкненне чалавека да песні школа абавязана скарыстаць як найлепш. Школа—асноўная база, дзе выхоўваецца пачуццё прыгожага, закладваюцца асноўныя разуменні аб эстэтыцы. І песня ў гэтай высакароднай справе — найбольш удзячны матэрыял. Я глыбока перакананы, што чалавек, які ўсёй душой імкнецца да песні, глыбока разумее непаўторную прыгажосць народнай песні, ніколі не зробіць неэтычнага ўчынку, ніколі не пакрыўдзіць таварыша.

Паназірайце за дзецьмі, якія спяваюць. Вось на сцэне цудоўны хор Гарадзецкай школы-інтэрната Кобрынскага раёна. Дзеці хораша спяваюць «Ленінскае племя» Азоліна, «Вяснукрасну» Наско і песню пра мужнага камуніста-змагара Хуліана Грымау, якую напісаў кіраўнік хору В. Фіузаў. Як свецяцца вочы ў юных спевакоў! Гэта ж школа падрыхтавала да агляду і праграму для духавога аркестра, які паспяхова выканаў фантазію на тэмы песень грамадзянскай вайны.

Мне вельмі спадабаўся хор без суправаджэння Чэрвеньскай сярэдняй школы пад кіраўніцтвам настаўніка І. Няборскага. Гэта — чатырохгалосы хор, у ім падабраны добрыя партыі тэнараў і басоў. Вельмі перспектыўны, зладжаны хор Барысаўскай школы-інтэрната пад кіраўніцтвам А. Білібіна. Добрае ўражанне пакінуў дзіцячы хор г. Маладзечна пад кіраўніцтвам Б. Гембіцкага. Калектыў спявае мякка, злітна і гнутка.

На аглядзе, такім чынам, няблага зарэкамендавала сябе Мінская вобласць, якая выставіла па-сапраўднаму добрыя харавыя калектывы. Гэтага не скажаш, напрыклад, пра Гомельшчыну. Тут запомніліся толькі два хоры — Камунараўскай сярэдняй школы-інтэрната і Жлобінскай сярэдняй школы № 5.

Упрыгожыў агляд хор хлопчыкаў Смаргонскай сярэдняй школы (кіраўнік Я. Вільхоўская). Вучні спяваюць злітна і не крыкліва. Вельмі шкада, што такіх хораў у нашай рэспубліцы надзвычай мала. Нават Мінскі Палац піянераў і школьнікаў, у якога ёсць добры змешаны харавы калектыў, розныя вакальныя ансамблі, яшчэ да гэтага часу не мае хору хлопчыкаў.

Былі на аглядзе і недахопы. Яны тлумачацца перш за ўсё непатрабавальнасцю тых, хто кіруе мастацкай самадзейнасцю ў раёнах. Напрыклад, выйшлі на сцэну вучні Мар'інагорскай сярэдняй школы № 2 Пухавіцкага раёна. І што вы думаеце яны праспявалі? «Смоленский парнишка Иван». Іншай песні хлопцы не знайшлі. Але як спявалі? Манера развязная, гэта ўзор дрэннага пераймання эстрады.

Выпадковасць у выбары рэпертуару немінуча вядзе да правалу. Вучні спяваюць у такіх выпадках тое, чаго не разумеюць, чаго не могуць уявіць, і спадзявацца тут на поспех марна. Вось чаму такім дысанансам прагучалі на аглядзе некаторыя добрыя рускія народныя песні і танцы, у якіх выканаўцы-вучні падкрэслівалі гэтакую «разухабистость», уяўную народнасць. Шкада было і вучняў, і песні, і танца.

У справаздачных канцэртах абласцей і заключным канцэрце выступала нямала аматараў мастацкага чытання. Што ж яны чыталі? З беларускіх паэтаў гучалі творы К. Крапівы, П. Броўкі, П. Глебкі, Г. Бураўкіна, Ул. Корбана, А. Вольскага, П. Прыходзькі — вось, бадай, і ўсё. Ці не замала для такога вялікага мерапрыемства, якім стаў у рэспубліцы III агляд самадзейнасці школьнікаў? Як жа магло здарыцца, што выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры не параілі сваім вучням новыя добрыя творы паэтаў, не навучылі іх па-майстэрску чытаць?

Крыўдна, але мушу адзначыць, што мастацкае чытанне было, бадай, самым адсталым жанрам на гэтым аглядзе. Мы гаворым, што мала ў нас выкладчыкаў спеваў. Іх сапраўды яшчэ не хапае. Але ў кожнай школе ёсць выкладчык беларускай літаратуры і мовы. Мірыцца з іх пасіўнасцю, абыякавасцю ў прапагандзе роднага слова, у прапагандзе лепшых узораў беларускай паэзіі нельга.

Дарэчы, глыбока ўсхвалявала мяне выступленне вучаніцы Касцюковіцкай сярэдняй школы Тамары Мергур'евай, якая прачытала вершы мясцовага паэта С. Пацёмкіна «Мая Касцюкоўшчына». Хочацца сказаць шчырае дзякуй выкладчыку літаратуры, які памог ёй развучыць гэты верш. Прачытала яго Тамара надзвычай хораша, пранікнёна. Мы, слухачы, адчулі непаўторную прыгажосць яе роднага краю.

Некалькі заўваг пра танцы. Іх было многа і розных—добрых і слабых. Так заўсёды бывае на аглядах. Парадавала імкненне віцяблян прапанаваць нешта сваё, арыгінальнае. Танцавальны калектыў Сенькаўскай васьмігадовай школы Верхнядзвінскага раёна пад кіраўніцтвам Веры Цярэня паставіў «Сенькаўскую танцавальную», выкарыстаўшы мясцовы фальклор. Аршанскі Дом піянераў (кіраўнік Таццяна Хмялеўская) паставіў танец, пабудаваны на мясцовым матэрыяле, — «Аршанскія ткачыхі». Цікавы жартоўны танец «Лесарубы» выканалі хлопчыкі Баравухскай сярэдняй школы Полацкага раёна пад кіраўніцтвам Ніны Данілавай. Наогул, на Віцебшчыне танцавальны рэпертуар багаты і разнастайны.

Рад арыгінальных работ прапанавалі танцавальны калектыў Магілёўскага Дома піянераў і школьнікаў («Мара аб флоце»), дзіцячая студыя Гомельскага Палаца культуры імя Ул. І. Леніна (беларускі народны танец «Лянок»), калектывы Уваравіцкай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна («Беларуская полька»), Івянецкай — («Івянецкія ганчары»), Мінскай школы-інтэрната № 10 («Лявоніха») і іншыя.

І якое было маё здзіўленне, калі на заключны канцэрт, наперакор рашэнню журы, не трапілі многія па-сапраўднаму мастацкія нумары. Заключны канцэрт складаўся па нейкаму дзіўнаму «прынцыпу»: адбіралася не заўсёды лепшае, перавага аддавалася розным «экзатычным танцам». Разлік вёўся на эфект, на эстраду. Гэта — школьная самадзейнасць, і тут гэты прынцып больш чым дзе не дарэчы.

Агляд закончаны. Які ж вывад неабходна зрабіць? Перш за ўсё трэба ўзняць ролю выкладчыкаў рускай і беларускай мовы і літаратуры і спеваў у эстэтычным выхаванні дзяцей. Мне здаецца, для таго каб творчае жыццё ў самадзейных калектывах школ не замірала, варта перыядычна арганізоўваць унутрышкольныя святы песень, конкурсы чытальнікаў, спевакоў, музыкантаў, праводзіць месячнікі школьнага тэатра, дэкады выяўленчага мастацтва, своеасаблівыя паэтычныя турніры, дзе пачынаючыя паэты-вучні пад кіраўніцтвам настаўніка чыталі б і абмяркоўвалі свае творы, выпускалі школьныя літаратурныя рукапісныя часопісы.

У многіх раёнах працуюць у нас народныя ўмельцы — скульптары, рэзчыкі па дрэву, інкрустатары, мастакі і ткачыхі. Няхай бы кожны з іх адабраў для сябе найбольш таленавітых вучняў і вучыў іх свайму майстэрству.

Да гэтага часу ў нас няма агульнарэспубліканскага метадычнага цэнтра, які б кіраваў школьнай мастацкай самадзейнасцю. Абласныя інстытуты ўдасканальвання настаўнікаў, на жаль, з гэтай задачай не спраўляюцца.

Да вайны пры кансерваторыі быў факультэт музычнага выхавання. Варта яго адавіць. Дырыжорска-харавы факультэт, які сёння працуе, займаецца самадзейнасцю для дарослых.

Ёсць неабходнасць у тым, каб запісаць лепшых выканаўцаў — удзельнікаў гэтага агляду — на магнітафонную стужку або нават выпусціць спецыяльныя грампласцінкі. Гэта будзе незаменны дапаможны матэрыял для школьнай мастацкай самадзейнасці.

Наша радыё і тэлебачанне таксама могуць стаць школай высокага эстэтычнага выхавання, калі будуць сістэматычна перадаваць і паказваць выступленні лепшых калектываў.

Многа год мы гаворым пра стварэнне зводнага школьнага хору ў некалькі тысяч чалавек. У нас павысілася культура харавога спявання. І мы можам па прыкладу нашых прыбалтыйскіх сяброў правесці ў сябе масавыя святы песні.

Хацелася, каб у наступных аглядах мастацкай самадзейнасці больш удзельнічала школ, асабліва сельскіх. Пакуль што ў гэтым аглядзе «выручалі» дамы піянераў і самадзейнасць гарадскіх школ. Нельга мірыцца з такім фактам, што, напрыклад, з Брэсцкай вобласці была прадстаўлена толькі самадзейнасць абласнога цэнтра, гарадоў Баранавіч, Пінска, Кобрынскага, Драгічынскага, Лунінецкага, Брэсцкага раёнаў. Адсутнічалі прадстаўнікі з Камянецкага, Іванаўскага, Бярозаўскага, Столінскага, Івацэвіцкага, Ляхавіцкага, Маларыцкага і іншых раёнаў. Мне скажуць, быў адбор, і толькі лепшыя калектывы трапілі ў Мінск. Але, калі не прадстаўлена цэлая група раёнаў, гэта насцярожвае і гаворыць аб нізкім узроўні мастацкай самадзейнасці, а значыць і эстэтычным выхаванні школьнікаў у гэтых раёнах.

Рыгор ШЫРМА,
народны артыст Саюза ССР.

ЭКСПАЗІЦЫІ СТАЛІ БАГАЦЕЙШЫЯ

У 1962 і 1963 гадах ленінградскія і гродзенскія археолагі выявілі каля рабочага пасёлка Краснасельскі старажытнейшыя на тэрыторыі нашай краіны шахты па здабычы крэменю. Больш дзвюх тысяч гадоў назад чалавек здабываў тут матэрыял, які ішоў на выраб прылад працы і зброі. Цяпер гэтыя каштоўныя экспанаты знаходзяцца ў залах Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

Пасля гадавога рамонту і рэканструкцыі музей расчыніў свае дзверы. У залах усё выглядае па-новаму. Экспазіцыя музея стала багацейшая і больш разнастайная.

Мы гутарым з загадчыкам аддзела гісторыі савецкага грамадства, навуковым супрацоўнікам музея Аляксандрам Аляксандравічам Кіркевічам. Вось што ён расказвае:

— Дзевятнаццаць гадоў Гродзеншчына стагнала пад пятою белапанскіх акупантаў. Дзевятнаццаць гадоў працоўныя не спынялі рэвалюцыйнай барацьбы. Гэты перыяд і раней быў шырока адлюстраваны ў музеі. Але за апошні час выяўлена шмат новых удзельнікаў падполля, новых дакументаў. Гэта унікальныя выданні — часопіс «Летапіс Таварыства беларускай школы», сатырыка-гумарыстычны часопіс «Маланка», «Беларуская граматыка» Б. Тарашкевіча (1920). Тут жа фотаздымкі рэвалюцыйных пісьменнікаў — ураджэнцаў Гродзеншчыны: М. Васілька, А. Салагуба, В. Таўлая, П. Граніта і іншых.

У стварэнні новай экспазіцыі актыўна ўдзельнічалі гродзенскія мастакі С. Сілуянаў, Ф. Труфанаў, С. Агнеў, Д. Парахня, Ф. Шунейка, В. Зыбайкін.

В. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ.

КІНО

ЛАБІРЫНТЫ ДЭТЭКТЫЎНАЙ ГУЛЬНІ

На «Беларусьфільме», бадай, яшчэ не было карціны, дзе незвычайнасць, заблытанасць сітуацыі, наяўнасць «тайны», якая раскрываецца ў фінальных кадрах, складалі б аснову сюжэта. Не было фільма з такімі выразнымі адзнакамі дэтэктыву. Праўда, прыгодніцкія фільмы ў беларускім кіно былі. Прыгадаем хоць бы «Лясную быль» ці «Палескіх рабінзонаў». Яшчэ больш можна назваць карцін, якія, не з'яўляючыся прыгодніцкімі, мелі прыгодніцкія элементы ў сваіх сюжэтах, — «Чырвонае лісце», «Гадзіннік спыніўся апоўначы» і інш. Але кінатворы, цалкам заснаваныя на заблытаных сітуацыях, прыгадаць цяжка.

Новая карціна «Беларусьфільма» «Чужое імя», пастаўленая рэжысёрам І. Шульманам па сцэнарыі А. Ваксера, М. Барана і М. Блеймана, з'яўляецца іменна такім творам. Напружанае чаканне канца падзей, разгадка сапраўднай падаплёкі паводзін героя — асноўнае, што трымае ўвагу гледача.

Чалавек па невядомых прычынах носіць імя іншага чалавека, які загінуў у час вайны. А калі гэтая акалічнасць раскрываецца, ён паводзіць сябе па меншай меры падазрона; стараецца ўсяляк выкруціцца ад адказу.

Што ж адбылося ў тыя ўжо далёкія гады? Якая прычына такіх дзіўных паводзін героя?

Стваральнікі фільма нібы запрашаюць гледача разам з імі паступова разблытаць клубок незвычайнай, загадкавай гісторыі. Каб раскрыць тайну, пракурор і следчы знаёмяцца з дакументамі, сустракаюцца з людзьмі, супастаўляюць факты даўно мінулых дзён, — і аднаўляюць ісціну, даючы адказы на задачу з многімі невядомымі.

Цікава? Так, цікава. Сюжэт, калі разглядаць яго ў агульных рысах, не ўдаючыся ў дэталі, тоіць у сабе сапраўды нямала захапляючага. Тым больш, што гаворка ідзе пра мінулую вайну, пра мужнасць невядомых герояў. Тэма гэтая асабліва блізкая нам сёння, калі тысячы людзей заняты аднаўленнем гісторыі самаадданай барацьбы народа ў час вайны, калі амаль штодзённа мы даведваемся пра новыя і новыя факты гераізму, мужнасці, непахіснасці чалавечага духу. Іменна пра гэта і хацелі расказаць аўтары, абраўшы для свайго апавядання сюжэт напружаны, востры, напоўнены загадкавымі падзеямі.

«Крымінальны» выпадак з шафёрам (яго ролю выконвае Ю. Саранцаў), які ў час вайны прысвоіў сабе імя партызана Ільіна, даследаванне прычын, якія прымусілі Драбеню (такое сапраўднае прозвішча шафёра) зрабіць такі малазразумелы ўчынак, — вось змест пададзеных у фільме падзей.

Але глядзіш карціну, і міжволі пачынаеш ставіць пад сумненне іх жыццёвую верагоднасць. Бо які б ні быў жанр твора, абраны аўтарамі, праўда акалічнасцей, логіка развіцця характараў застаюцца абавязковай яго ўмовай. Парушэнне гэтай умовы жорстка помсціць — падрывае веру гледача ў тое, што адбываецца на экране. Фільм у гэтым сэнсе мае нямала слабых мясцін. Адчуваюцца перш за ўсё сур'ёзныя пралікі драматургіі.

...Даведаўшыся, што шафёр носіць чужое імя, пракурор і следчы выклікаюць яго на допыт. Ільін—Драбеня яўна не збіраецца раскрыць праўду. Нічога не дамогшыся, прадстаўнікі правасуддзя адпускаюць яго і пачынаюць асабіста расследаваць «злачынства». Напалоханы шафёр тым часам таксама займаецца пошукам.

І вось ужо тут, калі адбываецца завязка ўсіх падзей, міжволі ўзнікае пытанне, на якое ў фільме так і не даецца дастаткова выразнага, зразумелага адказу: чым жа дыктуецца нежаданне Ільіна—Драбені расказаць пра тое, што адбылося з ім у гады вайны? Тлумачэнне гэтаму, на першы погляд, быццам бы ёсць: шафёр не перакананы, што гісторыя, расказаная ім, будзе зразумелая, і яму паверацъ,—у вельмі ўжо складаныя жыццёвыя абставіны трапіў ён у свой час. Але пракурор і следчы па невядомых прычынах не прыкладаюць чамусьці нават мінімуму намаганняў, каб усё ж дамагчыся прызнанняў. І пачынаюць самі, ледзь не са спартыўнай цікавасці, весці старанную, працяглую работу па ўстанаўленню ісціны. Ільін—Драбеня, шукае сам па сабе, дзеячы правасуддзя—самі па сабе. Сюжэт пушчаны па загадзя пракладзеных сцэнарыстамі рэйках і развіваецца наперакор элементарнай жыццёвай логіцы. Бо калі б аўтары не пагарджалі ёю, гісторыя, расказаная ў карціне, мела б усе шанцы добра завяршыцца недзе ў трэцяй-чацвёртай частцы.

Ільін—Драбеня, чалавек нялёгкай біяграфіі, складанага, гераічнага лёсу, якім ён выведзены ў фільме, з'яўляецца, гаворачы фігуральна, не толькі цэнтрам, да якога сыходзяцца ўсе сюжэтныя лініі, але і стаіць у «фокусе» аўтарскай задумы. Асуджаны ў свой час за зладзейства, далёкі ад палітыкі, ад выразнага разумення падзей, ён па збегу акалічнасцей сутыкаецца з чалавекам іншага складу — Ільіным, які робіць у абыякавай душы недалёкага Драбені сапраўдны пераварот. І Драбеня здзяйсняе тое, што не паспеў зрабіць Ільін... Сітуацыя вельмі і вельмі цікавая. Але ў фільме, на жаль, яна не разгорнута, працэс узмужнення героя раскрыты неглыбока.

Можна сказаць, што сцэны сустрэчы Драбені з Ільіным, подзвігу Драбені засталіся сцэнамі нявыкарыстаных магчымасцей. Пралікі стваральнікаў карціны ў іх асабліва відавочныя. Менавіта тут неабходна было праставіць галоўныя сэнсавыя, эмацыянальныя і псіхалагічныя акцэнты і менавіта гэтыя эпізоды патрабавалі найбольш глыбокай сцэнарнай распрацоўкі, стараннага рэжысёрскага і акцёрскага прачытання. Тут маглі адбыцца тыя мастацкія адкрыцці, якія, як гэта ні прыкра, у фільме адсутнічаюць.

Зразумела, прымаючы пад увагу жанравыя асаблівасці твора, нельга падыходзіць да яго, скажам, з меркамі псіхалагічнай драмы. Аднак гэтая акалічнасць зусім не выключае жыццёвай праўдзівасці характару, перакананаўчага паказу працэсу ўзмужнення чалавека.

Дзёрзкі подзвіг Драбені, які здолеў абдурыць вопытных ворагаў і выкрасці ў нямецкай камендатуры важныя дакументы, па сутнасці не ўзбагачае наша ранейшае ўяўленне аб героі, таму што вырашаны гэтыя эпізоды гранічна наіўна, у плане трэцеразрадных баевікоў.

Штампы, скарыстанне ўжо адноўчы знойдзенага ніколі не былі ўпрыгожаннем мастацкага твора, і «Чужое імя» ў гэтым сэнсе не выключэнне.

Адной з прычын непераканаўчасці самых важных сэнсавых эпізодаў карціны з'яўляецца таксама, на мой погляд, вельмі павярхоўнае выкананне Ю. Саранцавым ролі Драбені. Вонкавыя і ўнутраныя дадзеныя акцёра не вельмі стасуюцца з тым вобразам, які выпісаны ў сцэнарыі. У самых адказных сцэнах пераражэння героя акцёру яўна не хапае ўнутранай сабранасці, напоўненасці. Назіраючы за яго ігрою, цяжка месцамі пазбавіцца адчування фальшу, няшчырасці. Выбар выканаўцы, такім чынам, наўрад ці аказаўся ўдалы.

Калі да пралікаў, пра якія ўжо гаварылася, дадаць зусім бясколерныя вобразы пракурора і следчага, дык недахопы фільма стануць яшчэ больш відавочнымі.

Было б няправільна, гаворачы пра слабае, непераканаўчае ў карціне, не бачыць асобных яе вартасцей. Яны ёсць. Па-рэжысёрску выразна, напрыклад, вырашаны эпізод сустрэчы Ільіна з жонкаю на хутары, ёсць удачы ў выяўленчай фактуры фільма (аператар А. Аўдзееў, мастак Ул. Белавусаў), цікава выступіла ў маленькай ролі жонкі Драбені А. Дубровіна і г. д. Але гэта асобныя вартасці, асобныя ўдачы, якія не робяць рашучага ўплыву на ўражанне ад фільма ў цэлым.

Анатоль КРАСІНСКІ.

Смаргонскі ансамбль песні і танца імя М. Агінскага вярнуўся з Масквы, дзе выступаў з канцэртамі ў Крамлёўскім тэатры, на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР.

У Зорным гарадку пасля канцэрта на сцэну да ўдзельнікаў ансамбля прыйшоў лётчык-касманаўт П. Паповіч. Ён ад імя сваіх сяброў шчыра падзякаваў самадзейным артыстам за добрае выкананне цудоўных беларускіх народных песень і танцаў. Калектыстам за добрае выкананне цудоўных беларускіх народных песень і танцаў. Калектыў ансамбля атрымаў ад касманаўтаў адрасную папку са словамі падзякі за цікавы канцэрт.

На здымку — лётчык-касманаўт П. Паповіч сярод удзельнікаў Смаргонскага ансамбля песні і танца імя М. Агінскага.

Фота В. КОСЦІНА.

ЯК СТАЦЬ КІНАМЕХАНІКАМ?

Памятаю, як у маленстве я падыходзіў да клуба і гадзінамі прастойваў ля кінабудкі. Дзверы яе заўсёды былі адчынены, і ўсе —а хлапчукоў збіралася шмат— бачылі заклапочанага і сур'ёзнага кінамеханіка. Іншы раз мы памагалі яму паднесці што-небудзь, і ён дазваляў зайсці ў будку... Шчаслівыя мінуты!

Заўсёды кінамеханік здаваўся нам чалавекам, які шмат ведае, бачыць і ўмее. Нават дарослыя глядзелі на яго з нейкай зайздрасцю і павагай.

Хлапчукі задавалі пытанне:

— Як стаць кінамеханікам?

І слухалі грунтоўны адказ: чалавеку трэба многа вучыцца, многа ведаць...

Зусім нядаўна такое пытанне я задаў у Добрушы, у гарадскім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы кінамеханікаў № 3.

І слухаў адказы выкладчыкаў і вучняў. Мы хадзілі па аўдыторыях вучылішча, былі на занятках.

Увесь курс навучання тут разлічаны на адзінаццаць месяцаў. За гэты час будучыя кінамеханікі вывучаюць кінатэхніку, грамадазнаўства, арганізацыю работы кінасеткі, праходзяць практыку—тры тыдні ў вучылішчы, пяць —у кінасетцы. Пасля сканчэння вучылішча яны могуць, больш правільна, маюць права працаваць на любой кінапраекцыйнай апаратуры.

Пакуль, па-мойму, у вучылішчы сваю задачу разумеюць вельмі вузка — падрыхтаваць чалавека, які ўмее абыходзіцца з кінапраектарам. Але не ўсе выпускнікі, пакідаючы вучылішча, дасканала ведаюць апаратуру. Сёлета на экзаменах выявілася вельмі сумная карціна — некалькім вучням нельга было прысвоіць званне кінамеханіка па той прычыне, што яны зусім не ведалі кінапраекцыйнай апаратуры.

Я размаўляў з групаю выпускнікоў. Яны не толькі не маглі расказаць пра новыя фільмы, яны былі цвёрда перакананыя ў тым, што гэта не іх справа—«прыйдзе да нас фільм, паглядзім і даведаемся». Вось так і нараджаюцца шмат разоў чутыя адказы на пытанне «Пра што фільм?»:

— Ваенны...

— Пра шпіёнаў...

— Пра каханне...

Кінамеханік — і ўсе гэта добра ведаюць, разумеюць і прызнаюць — павінен быць чалавекам, які ўмее кваліфікавана, з веданнем справы прапагандаваць лепшыя дасягненні савецкага кінамастацтва, павінен быць культработнікам у поўным сэнсе гэтага слова. Але асноў культасветработы ні ў Добрушскім вучылішчы, ні ў іншых навучэнцы не атрымліваюць. І гэта недахоп, які адразу заўважаеш. Людзей не вучаць пісаць афішы, і не выпадкова потым з'яўляюцца на сценах клубаў непісьменныя аб'явы. Не вучаць гутарыць з гледачамі, і малады кінамеханік, які прыязджае на месца работы, у лепшым выпадку бачыць свае абавязкі ў тым, каб прадаць білеты, пракруціць карціну і любой цаною выканаць план.

І тут трэба падумаць, перш чым каго-небудзь абвінаваціць. Для таго, каб паступіць у вучылішча, дастаткова толькі мець накіраванне ад раённай кінасеткі. Ні ўступных экзаменаў, ні хоць бы гутаркі з паступаючымі, якая дала б магчымасць вызначыць прыблізна ўзровень іх падрыхтоўкі. Таму і трапляюць сюды людзі выпадковыя, якія пасля сканчэння вучылішча часта не працуюць па спецыяльнасці, а калі і працуюць, дык з халадком, і, вядома, не карыстаюцца павагай у гледачоў.

У час вытворчай практыкі вучні фактычна пакінуты на самапас— у вучылішчы ўсяго дзесяць выкладчыкаў, к таму ж у яго вельмі абмежаваныя сродкі на камандзіровачныя выдаткі. Вось чаму, ад'язджаючы з Добруша, практыканты застаюцца бескантрольнымі, і іх шчасце, калі яны трапляюць да кваліфікаванага і сумленнага кінамеханіка. Але ж у яго і сваіх клопатаў па горла...

Для таго, каб падрыхтаваць кінамеханіка, які б добра ведаў сваю справу, трэба, каб вучылішча мела ўсю неабходную кінатэхніку. Парадаксальна, але кінасетка нават пры жаданні не можа памагчы вучылішчу апаратурай. Мне расказваў адзін з выкладчыкаў, як ён ездзіў у Мінск «даставаць» гэтую апаратуру. У Камітэце па кінематаграфіі разумеюць, што трэба памагчы, і пачынаюцца ўзаемныя пошукі абыходных шляхоў. Цэлы камплект апаратуры прадаць нельга, не дазваляецца. Што ж, камплект раскамплектоўваецца і прадаецца па частках. Вынік, вядома, ёсць— вучылішчу аказана неабходная дапамога. Але хіба нельга зрабіць гэтую дапамогу законнай? Трэба і можна, тым больш, што Камітэт па кінематаграфіі ад вучылішча не адмаўляецца. І ўжо ва ўсякім выпадку абавязкова трэба памагчы вучылішчу і абсталяваннем, і многім іншым.

У Добрушы я яшчэ раз пераканаўся, што было б мэтазгодна перадаць вучылішчы кінамеханікаў у падпаленне Камітэту па кінематаграфіі. Бо накіраванні для паступаючых у вучылішча дае кінасетка, кадры рыхтуюцца таксама для яе. Але на вучэбную і выхаваўчую работу кінасетка ўплыву амаль не робіць, бо не мае права ў яе ўмешвацца.

Сапраўды, варта падумаць пра якасць падрыхтоўкі кінамеханікаў. Трэба перагледзець вучэбныя планы, узбагаціць і абнавіць тэхнічную базу вучылішча, не абмяжоўвацца пры прыёме толькі накіраваннямі з месц. Магчыма, нават трэба павялічыць тэрмін навучання.

Тады, вядома, стаць кінамеханікамі будзе цяжэй, але ж у кінафікацыю прыйдуць людзі, якія сапраўды любяць сваю нялёгкую справу.

А пакуль...

— Як стаць кінамеханікам?

— Вельмі проста: накіраванне і адзінаццаць месяцаў вучобы...

Ці не занадта лёгка дастаецца гэта творчая спецыяльнасць?

Д. РАДЗІНСКІ,
кар. «Літаратуры і мастацтва».

Н. ГОЛЫШАВА. «Карагод». (З дыпломных работ выпускніцкі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута).

НА ЎСПАМІН ПРА БЕЛАРУСЬ

Тканыя гальштукі, паясы, абрусы, сурвэткі, разнастайныя дэкаратыўныя вырабы з керамікі, дрэва, інкруставаныя шкатулкі, плеценыя з лазы, саломы сумачкі, кошыкі, вышываныя жаночыя фартушкі, блузкі, сукенкі, дзіцячыя касцюмчыкі, беларускія вышываныя ручнікі — усе гэтыя вырабы, творы нацыянальнага мастацтва Беларусі, сёння сталі ўсё часцей выкарыстоўвацца ў якасці сувеніраў. Іх можна набыць у магазіне «Паўлінка» ў Мінску і ў іншых магазінах рэспублікі.

Сувеніры ствараюць народныя ўмельцы, якія працуюць на прадпрыемствах Упраўлення мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР. Больш тысячы кваліфікаваных работнікаў пад кіраўніцтвам мастакоў уваскрашаюць і развіваюць колішнія традыцыі самабытнага беларускага народнага мастацтва, імкнучыся спалучаць традыцыйныя матывы з патрабаваннямі сучаснага густу.

Многія рамёствы беларускага народа аказаліся вельмі ўстойлівымі і існуюць да нашага часу — ткацтва, кераміка, пляценне, вышыўка, вязка і іншыя. Не толькі ў музеях, але і ў сучасных інтэр'ерах у гарадах і на вёсцы можна бачыць беларускія арнаментальныя посцілкі, зробленыя ўручную. У вёсках Чачэрскага раёна на Гомельшчыне, напрыклад, многія жанчыны носяць адзенне ручной работы.

І вось многія з гэтых народных майстроў згаджаюцца працаваць на вытворчасці або выконваюць пэўныя заказы. Так, напрыклад, на фабрыцы мастацкіх вырабаў пачала працаваць ткалляй Еўдакія Дзмітракова. Яна стварыла шмат узораў сувеніраў для сучаснага інтэр'ера: сурвэткі, дарожкі, напы на аснове традыцыйных беларускіх андаракаў. Лепшая яе работа — дэкаратыўнае панно «Памяць аб загінуўшых воінах за вызваленне Мінска». Еўдакія Дзмітранова вучыць свайму рамяству малодых спецыялістаў. Некалькі яе работ камісія «Рознаэкспарту» адабрала для Сусветнай выстаўкі ў Манрэалі (Канада).

Вельмі цэніцца і ў нас і за мяжой ручное пераборнае ткацтва Івянецкай фабрыкі мастацкай керамікі і вышыўкі. Гэтаму рамяству ў Івянцы навучыла многіх сваіх сяброўак Марыя Саконка, якая пераняла майстэрства ад маці. Тутэйшыя тканыя спаднічы, сурвэткі, абрусы атрымалі высокую ацэнку на Лейпцыгскім кірмашы 1965 года. Сёння асартымент тканін ткацкага цэха значна павялічыўся. Некаторыя з новых вырабаў будуць пасланы на выстаўку ў Манрэаль. І мне здаецца, было б справядліва, калі б у назву Івянецкай фабрыкі мастацкай керамікі і вышыўкі ўваходзіла б і слова «ткацтва».

Івянецкая кераміка вырасла на самабытнай нацыянальнай аснове творчасці народных ганчароў. Майстры Ф. Целішэўскі і В. Кулікоўскі перадаюць свой вопыт маладзейшым калегам. Сёння на ўскраіне Івянца пабудаваны новы цэх для вырабаў з керамікі. Ім кіруе В. Карунаў — выхаванец славутага Абрамцаўскага вучылішча пад Масквой. Толькі за апошнія некалькі месяцаў ён стварыў больш двух дзесяткаў новых сувеніраў з керамікі, якія запускаюцца ў масавую вытворчасць. Гэта вазачкі «Белавежская пушча», «Івянец», «Хваля», «Эстафета», «Беларусь», прыбор для сокаў, статуэтка «Купальшчыца» і шмат іншых. В. Карунаў шукае новыя віды тэхналогіі керамічных вырабаў, распрацоўвае новыя формы. Многія сувеніры, створаныя В. Карунавым, ухвалены Беларускім філіялам Усесаюзнага павільёна тавараў народнага ўжытку, адзначаны ў час конкурсаў і прэміраваны.

На Барысаўскай фабрыцы мастацкіх вырабаў створаны ўчастак па выпуску мініяцюрных сувенірных вырабаў, точаных з дрэва. Кіруе гэтым участкам умелец І. Мірончык. Па матывах беларускага посуду ім створаны сувеніры «Маслабойка», «Ступа», «Місачкі», «Гаршчочкі», «Салянкі» і іншыя. Для гэтых вырабаў умела выкарыстоўваюцца адыходы Барысаўскай фабрыкі пяніна.

Карыстаюцца папулярнасцю сувеніры з інкрустацыяй саломкай Жлобінскай фабрыкі мастацкай інкрустацыі, точаныя і распісныя драўляныя рэчы Брэсцкай фабрыкі сувеніраў, дзе пад кіраўніцтвам таленавітага ўмельца Д. Сакажынскага створаны цэх разьбы па дрэву і інтарсіі. Д. Сакажынскі— аўтар многіх шырокавядомых сувеніраў — «Зайчык», «Ліса», «Вавёрачка», «Елачка», «Бярозка», «Юрачка», «Трактарыст» і іншыя. Вучань Д. Сакажынскага А. Таруц — умелы спецыяліст інтарсіі і разьбы.

На фабрыцы мастацкіх вырабаў у Слуцку, з якім звязана славутае старадаўняе майстэрства слуцкіх паясоў, вырабляюцца сувенірныя тканыя вырабы — сучасныя жаночыя і мужчынскія паясы, гальштукі, закладкі для кніжак, капы, спадніцы.

Многа народных майстроў на Гомельскай фабрыцы мастацкіх вырабаў ствараюць сувеніры, плеценыя з лазы.

На Магілёўшчыне, якая здаўна славіцца вырабамі, плеценымі з саломы, на фабрыцы мастацкіх вырабаў развіваюцца традыцыі, панінутыя ў спадчыну некалі славутым майстрам Галанчанкам. Група маладых спецыялістаў пад кіраўніцтвам К. Арцеменні паспяхова спалучаюць салому з льняными тканінамі — ствараюць адмысловыя жаночыя сумачкі, цукерачніцы, хлебніцы. Далёка за межамі Беларусі славяцца майстры магілёўскай вышыўкі. Сем мадэлей новых фасонаў з вышыўкамі па льну з лаўсанам абраны замежнымі фірмамі для экспарту ў Швейцарыю, Нарвегію і ФРГ. На экспарт пойдуць і вырабы Мінскай, Гродзенскай, Баб-руйскай фабрык мастацкіх вырабаў.

Сёння мы можам смела сказаць: у нас ёсць беларускі сувенір, ён упэўнена выходзіць на міжнародную арэну.

Марыя ШАЎЦОВА,
старшы мастак Упраўлення мастацкай прамысловасці Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР.

ШЭФЫ—МУЗЫЧНЫЯ ШКОЛЫ

ГОМЕЛЬСКАЕ абласное ўпраўленне культуры аб'явіла конкурс-агляд музычных школ, мэта якога—наладзіць найбольш актыўную дапамогу сельскай самадзейнасці, арганізаваць культурнае абслугоўванне працаўнікоў вёскі.

Добрымі шэфамі сельскіх калектываў з'яўляюцца Рагачоўская, Жыткавіцкая, Брагінская, Веткаўская і Петрыкаўская музычныя школы. Напрыклад, выкладчыкі і выхаванцы Рагачоўскай музычнай школы наладзілі сёлета ў калгасах і саўгасах раёна 26 канцэртаў. На грамадскіх асновах яны рыхтуюць пяць баяністаў для сельскіх клубаў, памагаюць самадзейным артыстам калгаса «Савецкая Беларусь», Доўскай доследнай сельскагаспадарчай станцыі і малочна-кансервавага камбіната.

Выкладчыкі Брагінскай музычнай школы прымаюць удзел у семінарах работнікаў культуры, памагаюць ім развучваць новыя песні і танцы. Калектыў школы шэфствуе над самадзейнасцю Малейкаўскага, Сабалёўскага, Мікуліцкага сельскіх клубаў. Разам з падшэфнымі калектывамі музычная школа арганізавала сёлета 80 канцэртаў у калгасах раёна.

З дапамогай выкладчыкаў Жыткавіцкай музычнай школы пры раённым Доме культуры створаны хор, эстрадны аркестр і ансамбль баяністаў.

Я. КРАЎЧАНКА,
А. СТАНКЕВІЧ,
метадысты Гомельскага абласнога Дома народнай творчасці.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

ТЭАТР № 7

«Дні з'езда былі незабыўнымі днямі майго жыцця» — гэтымі словамі заканчвае свае нататкі дэлегат XXIII з'езда КПСС народная артыстка РСФСР Л. Макарава, надрукаваныя ў ліпеньскай кніжцы часопіса.

У раздзеле «Спектаклі» — артыкулы і рэцэнзіі аб спектаклях «Пачатак дарогі» П. Бярнацкага ў Цэнтральным дзіцячым тэатры, «Анна» М. Ганінай у драматычным тэатры імя К. С. Станіслаўскага, «Рэвізор» М. Гогаля ў Малым тэатры, «Антыгона» Сафокла ва Украінскім драматычным тэатры імя І. Франка, «Удавец» А. Штэйна ў Куйбышаўскім драматычным тэатры, «Трэнь-брэнь» Р. Пагодзіна ў Ленінградскім тэатры юнага гледача, «Шторм» Ул. Біль-Белацаркоўскага ў Пензенскім тэатры, а таксама нататкі пра гастролі Башкірскага тэатра ў Маскве.

Вялікі артыкул Б. Галушкі і К. Хадзеева «Як важна быць сур'ёзным» прысвечаны рускаму драматычнаму тэатру імя М. Горкага ў Мінску. Аўтары аналізуюць спектаклі «Дзеці сонца» М. Горкага, «Мая старэйшая сястра» А. Валодзіна і «Маскарад» М. Лермантава.

«Таварышу тэатру!» — так называецца артыкул Б. Мядзведзева, прысвечаны аналізу фільмаў аб выдатных акцёрах нашага часу.

Саратаўскі крытык В. Яўчноўскі ў сваіх нататках аб сучаснай драме ставіць вострае пытанне: «Чаму, толькі карыстаючыся пасрэдніцтвам прозы, тэатр можа прывесці на сцэну тых, што ідуць на навалніцу або здабываюць вялікую руду?»

У раздзеле «Трыбуна» публікуецца грунтоўны артыкул архітэктара В. Вінаградава «Як будаваць тэатральныя будынкі?»

З нумара ў нумар папаўняецца партрэтная галерэя часопіса. У сёмым — нарыс А. Крона пра Астангава і Н. Чарновай — пра салістаў балета Вялікага тэатра Уладзіміра Васільева.

Пад рубрыкай «З гісторыі савецкай рэжысуры» друкуецца артыкул Б. Галуборўскага пра вядомага савецкага рэжысёра Фёдара Каверына.

Працягваецца публікацыя мемуараў Алісы Каанен.

У раздзеле «Тэатральныя навіны» — інтэрв'ю з Г. Таўстаногавым, рэпартаж з шостай Усесаюзнай выстаўкі мастацкіх фотаздымкаў, расказ пра дэбют Тамілы Шыраліевай, нарыс пра трацце пакаленне МХАТ, карэспандэнцыя пра раскопкі антычнага тэатра ў Крыме.

З жыццём зарубежных тэатраў знаёмяць артыкулы Ул. Піменава «У Румыніі» і Р. Баяджыева «Калі мастацтва застаецца ў мінулым», карэспандэнцыі з Польшчы, Францыі, ГДР, ЗША, Югаславіі, ФРГ, Чэхаславакіі.

У часопісе друкуецца народная драма ў дзвюх частках грузінскага драматурга Георгія Хухашвілі «Дарогі» ў перакладзе Ю. Чапурына.

145 СПЕКТАКЛЯЎ ДЛЯ СЕЛЬСКІХ ГЛЕДАЧОЎ

Гродзенскі драматычны тэатр пачаў свае традыцыйныя гастролі па сваёй вобласці. У калектыве створаны тры брыгады. За паўтара месяца выступленняў па родным прынёманскім краі артысты паставяць не менш як 145 спектакляў. Пастаноўкі тэатра прагледзелі ўжо сотні паляводаў, механізатараў, жывёлаводаў многіх калгасаў і саўгасаў вобласці.

Гастролі па Гродзеншчыне працягнуцца да палавіны жніўня.

В. ДЗЁМІН.

НА БЕРАГАХ БАЛТЫКІ

Шмат спектакляў паказаў на Віцебшчыне Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага за час мінуўшых гастроляў. З Віцебскай вобласці творчы калектыў перабазіраваўся на берагі Балтыкі—у Калінінград.

Мінскія артысты пакажуць калінінградцам «Пад адным небам» і «Куды ідзеш, Сяргей?» А. Маўзона, «Мая старэйшая сястра» А. Валодзіна, «Салдат і Ева» Е. Барысавай, «Двое на арэлях» У. Гібсана. З класічных твораў у рэпертуары горкаўцаў — «Маскарад» М. Лермантава, «Улада цемры» Л. Талстога, «Антоній і Клеапатра» В. Шэкспіра.

Гастролі беларускіх артыстаў працягнуцца да канца месяца.

Аперэтай «Вяселле ў Малінаўцы» пачаў гастролі ў Брэсце Львоўскі абласны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр (г. Драгабыч). Гледачы цёпла сустрэлі артыстаў брацкай рэспублікі.

На здымку — сцэна са спектакля «Вяселле ў Малінаўцы». У ролі Соф'і Думы — заслужаная артыстка УССР Лідзія Пілінская, Ярынкі — артыстка Людміла Леўчанка.

Фота М. ПАПОВА.

Уладзімір ДУБОЎКА

НАЙ-ДАРАЖЭЙШЫ СКАРБ

НАРОДНАЯ КАЗКА

Памяці паэта Ісаака ПЛАТНЕРА

Апошнім часам я працаваў над празаічным творам для юнацтва пад назвай «Жоўтая акацыя» (здаў у выдавецтва). Адначасова скончыў працу і над другою рэччу, таксама празаічнай, — «Думка думку паганяе». У апошнім раздзеле гэтага твора ёсць вершаваная казка, якую і пасылаю ў рэдакцыю «Літаратуры і мастацтва».

Сюжэт гэтай казкі даў мне няжчык І. Платнер. Мы з ім мелі правесці як бы спаборніцтва: напісаць на адзін сюжэт казкі і паглядзець, як у каго складзецца. Але пакуль збіраліся паспаборнічаць, І. Платнер памёр, я ж так і не браўся за гэтую справу.

АУТАР.

1

У даўно мінулым часе
гэта дзея адбылася.

Чалавек адзін нядрэнны
меў сады і дом каменны,

меў жывёлы рознай статак.
Словам—добры меў дастатак.

А ў дадатак да багацця
трох сыноў ён меў у хаце.

Час ідзе няспынная хваляй.
Хлопцы хутка паўзрасталі.

Калі бацька свет пакіне,
будзе ў хаце калатніна:

за вуглы пачнецца сварка,
змізарнее гаспадарка,

як акраяц, на тры скібы
перакроіцца сядзіба...

Прадбачаючы такое,
бацька повен непакою.

— Не! Зраблю зусім інакш:
дам такую ім задачу,

каб усё, што набылося,
аднаму і дасталося.

Без ніякага адкладу
кліча ён сыноў на раду.

Пасадзіў усіх на лаве
і пачаў казаць аб справе.

— Вось, сыны, надумаў што я:
вас усіх, вядома, трое,

а сядзібы нашай, хаты
на траіх і малавата.

Трэба вам на свет шырокі
паглядзець уласным вокам.

Можа дзе якая справа
будзе і для нас цікава.

Вам памогуць тыя весці
лепшы лад у хаце весці.

Разам з гэтым і багацце
вы рупліва набывайце.

Тры зімы, вясны і леты
вам на ўсё даецца гэта.

Хто, пабыўшы ў падарожжы,
з вас траіх прынесці зможа

найвялікшае багацце, —
гаспадарыць будзе ў хаце.

Той адзін, усё, што маю,
ад мяне і атрымае.

Памятайце толькі слова,
не забудзьцеся умовы:

покуль сонца ў захад пройдзе,
хай вас тут усіх і знойдзе.

Не пазней адной хвіліны
быць з набыткам тут павінны.

Буду вас чакаць, сыночкі,
роўна цераз тры гадочкі...

Пакланіліся ўсе тату,
брат схіліўся перад братам,

а пасля, з вясёлым спевам,
хто направа, хто — налева...

2

Трох гадоў — як не бывала,
хоць, здавалася б, памалу

дні праходзілі за днямі
над палямі, над лясамі.

Цераз тры гады да таты
большы сын вярнуўся ў хату.

Толькі днецца пачынала,
толькі ў небе сонца стала, —

большы сын, падняўшы клямку,
увайшоў у хату з ганку.

Прывітаўся. Зняўшы торбу,
бацьку кажа:

— Здзейсніў добра
твой наказ! Прынёс багацце, —
будзеш толькі дзівавацца!

Тыя вымавіўшы словы,
ён паклаў на стол дубовы

самацвет — брыльянт цудоўны,
паўкапе вясёлак роўны.

Зазіхцела, заблішчэла,
быццам сонца ў покут села,

а барвовае праменне
рассявае поўнай жменяй.

Паглядзеў стары маўкліва.
Потым кажа:

— Праўда, дзіва!

За сваё жыццё даўгое
бачу першы раз такое.

Раскажы, сынок, адкрыта,
як яно табой здабыта?

— Пераходзячы няспынна
ад краіны да краіны,

я дайшоў аж да дзясятай,
хоць было далекавата.

Там пабачыў я у храме
паміж іншымі багамі

аднаго з брыльянтам гэтым,
найдзіўнейшым самацветам.

Вельмі спрытна, вельмі хітра
я яго адтуль і выкраў.

ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЦЁТКІ

ПЕСНІ БУРЫ І СВАБОДЫ

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА.

Цераз моры, акіяны
Палячу ў далёкі край,
Бо люблю я ураганы,
Во я ў буры чую рай.
Во у дзікай, страшнай буры
Маім думам лягчэй плыць,
Во на дзікіх грывах хвалі
Я аб песні магу сніць.
Во я толькі на прасторах
У звонкай ліры маю слух,
Во у дзікай, страшнай буры
Крэпне мой свабодны дух,

Гэта — верш Цёткі «У дарогу». У ім — грамадскае і творчае крэда паэтэсы, талент якой быў абуджаны громам першай рускай рэвалюцыі.

Так, творчасць Цёткі, як і ўся яе грамадская, асветніцкая, палітычная дзейнасць, непарыўна звязана з рэвалюцыяй 1905 года, калі народ усёй вялікай Расіі, у тым ліку і беларускі, выступіў на барацьбу за свабоду, супраць самаўладства, супраць прыгнёту і тыраніі. Рэвалюцыя 1905 года ўскалыхнула грамадства, вылучыла сваіх трыбунаў. Такім трыбунам была і Цётка — паэтэса, рэвалюцыянерка, асветніца, артыстка, вучоная, медыцынскі работнік, актыўны грамадскі і палітычны дзеяч.

Вершы Цёткі «Хрэст на свабоду», «Мора», «Пад штандарам» пісаліся па гарачых слядах падзей. Кожны з іх быў нібы выбух бомбы, нібы гарматны стрэл па самаўладству. «Хрэст на свабоду» ведала напамяць уся рэвалюцыйная Вільня. Літоўская сацыял-дэмакратычная партыя надрукавала верш як пракламацыю, і ён у тысячах экземпляраў разышоўся па гарадах і вёсках Беларусі. Ён быў перакладзены на польскую і нямецкую мовы.

З СУЗОР'Я ПЕРШЫХ

Свабодзе народнай, рэвалюцыі аддавала паэтэса ўвесь свой палымяны талент. У вершы «Вера беларуса» яна заклікае:

Цяпер, брацця, мы з граніту,
Душа наша з дынаміту,
Рука цвёрда, грудзь акута,
Пара, брацця, парваць пута!

Яшчэ і яшчэ раз апявае яна рэвалюцыю. Сілу рэвалюцыі Цётка параўноўвае з сілаю марской буры, якой не страшныя ніякія скалы, ніякія перашкоды. Яркім творам, поўным рэвалюцыйнага пафасу, з'яўляецца і яе апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі».

Але Цётка не толькі апявала рэвалюцыю. Яна была і яе чорнарабочай. У 1904—1905 гадах яна арганізоўвае рабочыя гурткі, выступае на іх з прамовамі, збірае грошы ў дапамогу забастоўшчыкам, становіцца членам рэвалюцыйнай арганізацыі ў Новавілейскай лячэбніцы, дзе ў 1905 годзе працавала фельчарыцай. Цётка была звязана з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі ў Вільні, сябравала з членам Віленскага камітэта РСДРП Барысам Вігілёвым, з якім часта выступала на мітынгах.

Паэтэса праводзіла вялікую работу сярод беларускіх жанчын. Як дэлегатка ад беларускіх жанчын. Цётка прымала ўдзел у жаночым з'ездзе, які адбыўся ў маі 1905 года ў Маскве.

У канцы 1905 года рэвалюцыйная арганізацыя ў Нова-Вілейцы была разгромлена. Хаваючыся ад царскай паліцыі, паэтэса была вымушана пакінуць радзіму. Яна выязджае ў Галіцыю. Але і далёка ад радзімы Цётка жыве яе інтарэсамі, працуе дзеля яе дабра і шчасця. У Жоўкве, паблізу Львова, яна выдае зборнікі сваіх рэвалюцыйных вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская». Там жа складае і выдае кніжачку «Гасцінец для маленькіх дзяцей» — некалькі казак і апавяданняў, перакладзеных ёю з украінскай мовы. У Пецярбурзе ў гэты ж час выдаецца і яшчэ адна кніжка, напісаная Цёткай спецыяльна для дзяцей — «Першае чытанне для дзетак беларусаў». Гэтыя кніжкі былі першымі кніжкамі для дзяцей на беларускай мове, і значэнне іх нельга перабольшыць. За адно гэта Цётцы трэба паставіць помнік.

У Львове паэтэса знаёміцца з украінскімі і польскімі дзеячамі грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, становіцца членам саюза мясцовай рэвалюцыйнай моладзі. Новыя сябры памаглі ёй уладкавацца на працу ў бібліятэку. Цётка працуе, вучыцца ва універсітэце (вольнай слухачкай), пачынае пісаць навуковую працу «Батлейкі на Беларусі і іх сувязь з польскай літаратурай драматычнай».

Ды тут адужаў яе вораг, які быў ворагам усёй інтэлігенцыі таго часу — сухоты. Цётка выехала ў Закапанэ, дзе некаторы час жыла ў санаторыі для бедных студэнтаў, а пасля — у Італію. Уражаннямі ад паездкі па Італіі яна дзеліцца ў нарысе «З дарогі», напісаным у форме лістоў. Нарыс заканчваецца лістом да маці:

«Мамачка, хачу табе нешта сказаць, але не паверыш так адразу насля маіх лістоў: дай хіба вушка. Мамачка, нідзе так не пекна, як у нас. Прымерам, седзімо мы з табою на нашым прыгорачку. У даліне ля рэчкі бягуць загоны сівога аўсу, па ручаю ляжыць палоска бела-рожавай рачыхі, а ніжэй вусаты ячмень упіраецца пазалацеўшымі загонамі ў канюшыну. Альбо як бульба наша сінімі кветачкамі ківаецца на сонцы. Чырвоныя шчаўі бягуць межамі. Мядункі, смалянкі, іскры гудуць пчолкамі. Купальскае зеллечка кругом пахне, сіняя мацярушка ў купінах крые свае лекі, сардэчнікі чырвонымі ніткамі пераскокваюць ручайкі, а васількі ў нашым жыце!»

На чужыне Цётка вельмі сумавала па радзіме. Сум выліваўся ў вершах — «На чужой старонцы», «З чужыны», «Родная вёска», «Мае думкі». У апошнім ёсць такія радкі:

...Прыгарнуць усё ў дарозе,
Каплю шчасця, долі ўліць,
Думаць ўсюды аб народзе,
Родны край усюды сніць,
То рассыпацца расою
Па галінках, па лістках,
То абняцца так з зямлёю,
Каб ніхто разняць не мог.

Як бачна, Цётка была паэтэсай яркай вобразнасці, паэтычнай знаходкі, яркага параўнання, метафары. Аддаючы належнае грамадзянскаму гучанню яе паэзіі, у нас часта недаацэньваецца мастацкі ўзровень яе вершаў. Але ж сказаць, што яна хоча «абняцца так з зямлёю, каб ніхто разняць не мог», пад сілу толькі моцнаму таленту.

Цётка некалькі разоў нелегальна прыязджала з эміграцыі на радзіму — то ў Вільнюс, то ў Пецярбург. У адзін са сваіх прыездаў яна ўключаецца ў вялікую работу па арганізацыі беларускага тэатра (разам з Ігнатам Буйніцкім), сама выступае на сцэне, прымае ўдзел у вечарынках, якія ў той час наладжваліся ў Пецярбурзе і Вільні.

Цётка была арганізатарам і рэдактарам першага беларускага часопіса для дзяцей «Лучынка». Яна шмат піша для часопіса і сама, і актыўна запрашае пісаць для «Лучынкі» іншых — знаёмых літаратараў, беларускіх студэнтаў. У лісце да лінгвіста Тарашкевіча яна пісала: «Тарасе! Чаго сядзіш на Парнасе? Злазь, а то лазы ад Цёткі дастанеш. Загадай, каб хлопцы што напісалі. Ты аб асаблівасці беларускай мовы напішы, з выясненнем, што беларуская мова ёсць мова, а не нарэчча, як шмат хто кажа. Студэнтам-жэўжыкам дай тэмы...»

Сярод гэтых тэм Цётка вылучае наступныя: Пінскія балоты і іх асушэнне, гісторыя балот; пяскі на Гродзеншчыне і занос пяскамі вялікіх абшараў зямлі; зацямненне сонца; эміграцыя ў Амерыку; нацыяналізацыя зямлі і г. д.

Сама Цётка, акрамя апавяданняў «Зялёнка», «Лішняя», «Міхаська», змясціла ў «Лучынцы» шмат навукова-папулярных артыкулаў: «Папараць-кветка», «Газа», нізку артыкулаў «Гутаркі аб птушках». У артыкуле «Да школьнай моладзі беларускай» Цётка звяртаецца да вясковых хлопчыкаў і дзяўчынак з заклікам збіраць матэрыялы для беларускай батанікі.

Усе гэтыя артыкулы Цётці сведчаць аб тым, як горача старалася яна пашырыць асвету сярод роднага народа, як імкнулася зацікавіць моладзь грамадскімі праблемамі, выхаваць іх актыўнымі грамадзянамі, гаспадарамі сваёй зямлі.

Калі пачалася першая сусветная вайна, Цётка зноў вяртаецца да работы ў галіне медыцыны. Спачатку памагае параненым салдатам у акопах, пасля ідзе працаваць у тыфозны барак. Засталося некалькі лістоў ад салдат да медыцынскай «сястрыцы» Цёткі. Гэтыя лісты — сведчанне вялікай любві да яе, удзячнасці за дапамогу, за добрае сэрца.

У студзені 1916 года Цётка атрымала з дому паведамленне, што цяжка захварэў бацька. Паэтэса паехала на радзіму, у Стары Двор. Бацькі ўжо не застала — яго павезлі ў Ліду, дзе ён і памёр.

Тыф лютаваў і на радзіме Цёткі. Верная сваім абавязкам слугі народа, яна пачала ездзіць па вёсках, памагаць людзям. Страшная хвароба, ад якой яна ратавала людзей, не абмінула і саму паэтэсу. Яна захварэла на тыф і ў ноч з 4 на 5 лютага 1916 года памёрла.

Перад смерцю прасіла, каб пахавалі яе на радзіме, каб вакол яе магілы былі родныя палі і лясы, каб і пасля смерці была яна разам са сваім народам...

Такою была Алаіза Пашкевіч — паэтэса Цётка. Такою — шчыраю, адданаю роднаму краю і роднаму народу — застаецца яна і ў памяці нашчадкаў.

Лідзія АРАБЕЙ.

На радзіме Цётці. У ваколіцах вёскі Пясчаны.

ЦЁТКА

У шчырым бары неспакой
загаю—
Засну, падклаўшы пад вуха
Матчын прыпол — зямлю маю,
Падушку з гусінага пуху.

Там верасы пяючыя
Сцішна атуляць вякамі
Ногі мае бягучыя,
Сэрца маё — камень.

Вецер глухі змые сляды,
Слёзы бяссілля вытра...
З сэрца майго — скаргі, жуды,
З каменя — дрэва выпра.

Скокне дзяўчо на мяне-зямлю
Сіняю раніцай весняй.

...Я з таго дрэва цымбалы
зраблю.
Мушу дайграць тваю песню,
Цётухна.

На зямлі Абая

На стале ў мяне ляжыць томік твораў Цёткі. Я прывёз яго з Беларусі і берагу, як дарагі скарб. Чытаю і перачытваю часам сумныя, часам суровыя бессмяротныя радкі паэтэсы. Чытае іх і мая сям'я. А нядаўна ў сельскім магазіне я купіў яшчэ адзін томік Цёткі — ужо на рускай мове. Цяпер яны жывуць побач, гэтыя два томікі. І не толькі ў мяне жыве Цётка — жыве яна ў многіх хатах маіх землякоў-беларусаў, у хатах рускіх, казахаў, немцаў, карэйцаў, янія жывуць у сяле, працуюць у калгасе «Чырвоная звязда». Зойдзеш у хату, пацікавішся хатняй бібліятэчкай гаспадароў, і поплеч з томікамі Пушкіна, Лермантава, Ясеніна знаходзіш творы Купалы, Коласа, Цёткі.

Далёка, аж на радзіму Абая, заехала Цётка ад сваёй любай Беларусі, але і тут адчуе яна сябе як дома. Асабліва добра прыжылася яна ў сэрцах беларусаў. Некаторыя з іх, прыехаўшы ў Казахстан як перасяленцы яшчэ да рэвалюцыі, прывезлі творы Цёткі дарэвалюцыйнага выдання і берагуць іх, як святыню. Вось сямідзесяцігадовы Сымон Цярушкевіч, якога ў 1913 годзе прыгнала сюды беззямелле з Гродзеншчыны. Ён і цяпер успамінае словы селяніна, які стаяў над крывавымі разорамі і крычаў: «Вузка! Цесна! Мала!».

— Прачытаў я тады гэта маленькае апавяданне, — кажа Цярушкевіч, — і ўзяло мяне за сэрца гора, і апанаваў мяне роздум. А як пачуў пра перасяленне, збыў свой кавалачак зямлі і паехаў. Тут не было «цесна» і «мала» — прастор вялікі, зямлі колькі хочаш, ды толькі толку мала... Беднасць заядала — ні каровы, ні каня не было. А без каня цаліну не падымеш. Вось і выходзіла, што для бедняка тады лёс быў усюды аднолькавы... Часта вечарамі чытаў я гэтую кніжачку. З тых часоў і берагу яе...

Многія вершы паэтэсы Сымон Цярушкевіч ведае напамяць — вывучыў яшчэ ў тыя далёкія часы. Многія яму дапамагае ўспомніць унук Алесь — школьнік.

У мясцовай сельскай бібліятэцы, дзе бібліятэкарам працуе Кацярына Завадская, таксама беларуска і таксама вялікая прыхільніца таленту паэтэсы, зроблена літаратурная выстаўка, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння Цёткі: у кутку — партрэт паэтэсы, на паліцах — яе творы, крытычныя артыкулы пра іх, фотаздымкі...

Землякі-беларусы адзначаюць юбілей сваёй любімай паэтэсы...

М. ЗАСТОЛЬСКІ.
Чымкенцкая вобласць.



Светлагорская гарадская дзіцячая бібліятэка маладзейшая за многіх сваіх чытачоў. Сюды па кнігі прыходзяць 1 337 піянераў і школьнікаў. Для іх працуюць чытальня і абанемент, дзе налічваецца звыш 20 тысяч кніг, выпісаны дзесяткі назваў газет і часопісаў.

На гэтым здымку вы бачыце за выбарам кніг вучаніц сярэдняй школы № 4 (злева направа) Тамару Астаніну, Валю Цірко, Тамару Фаменка і Галю Чэлышаву.

Фота М. МІНКОВІЧА.

СЯРОД КНІГ

Слова бярэ ЧЫТАЧ

ХЛОПЧЫК ШУКАЕ СОНЦА

На дзіцячай кніжнай паліцы стала цясней — нядаўна выйшла кніжка вершаў Петруся Макаля «Хлопчык будзіць сонца». Кніжка невялікая: у ёй сабрана ўсяго два дзесяткі вершаў, але затое большасць з іх — па-сапраўднаму цікавыя, займальныя, дасціпныя. З дзецьмі — кніжка напісана для малодшага ўзросту — паэт размаўляе шчыра і сур'ёзна, без сюсюкання. Ён стараецца пісаць так, каб малы чытач не проста прачытаў, але і падумаў пасля над тым, што прачытаў.

Вось верш «У час перапынку». Дзеці на перапынку пачынаюць расказваць адзін аднаму, хто што зрабіў за лета. Вядома, тут не абышлося без пахвальбы, без выдумкі. Але аўтар не павучае чытача: маўляў, ах як нядобра гаварыць няпраўду! Пра гэта здагадаецца сам чытач, уволю пасмяяўшыся над такім, напрыклад, расказам аднаго хлапчука-задавакі.

Бухаў вецер ураганам,
Грукатаў дзевяты вал.
Знесла хваляй капітана,
Ну, а я трымаў штурвал.

Пра што б ні пісаў паэт — пра школу, пра дзіцячыя гульні, пра сонца, лес. — ён умее знайсці новыя, свежыя і разам з тым простыя вобразы. У вершах яго — шчырая, інтымная інтанацыя. А яшчэ ў вершах П. Макаля шмат гумару, светлага дзіцячага смеху (вершы «Ручай», «У школу», «Уначы пасыпаў снег», «Ехаў Слаўка» і інш.).

Ёсць, на жаль, у кніжцы і слабаватыя вершы з дзяжурнымі, агульнымі радкамі («Кастрычнік», «Нястомныя і ўпартыя»). Але пасля таго светлага і прыемнага ўражання, якое пакідаюць лепшыя творы зборніка, гаварыць пра яго пралікі не хочацца.

І. ГАЛУБОВІЧ,
работнік райфінаддзела.
г. Маладзечна.

П. Макаль. «Хлопчык будзіць сонца». Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1966.

ПЕРШЫЯ АДКРЫЦЦІ

Невялікая кніжка Аркадзя Марціновіча «Неадкрыты востраў» пачынаецца з таго, што, скончыўшы другі клас, хлопчык Паўлік прыязджае на цэлае лета да свайго дзядзькі лесніка Івана Патапавіча ва ўрочышча Ятрань.

Тут для Паўліка, гарадскога хлопчыка, надыходзіць цудоўная пара адкрыццяў. Ятрань для яго — «гэта неабжыты востраў, які трэба адкрыць, гэта далёкі край, дзе адны таямніцы і дзівосы». Дзень за днём, крок за крокам ён пачынае абжываць гэты «востраў», разгадваць яго таямніцы, здзіўляцца і радавацца яго дзівосам.

У гэтым Паўліку дапамагае Іван Патапавіч, які любіць лес, ведае яго загадкі, яго капрызы. І сваю любоў і замілаванне да лесу, да яго законаў, свае веды ён стараецца (наколькі гэта магчыма, улічваючы ўзрост пляменніка) перадаць Паўліку. Шчырасць і выключная тактоўнасць у адносінах да інтарэсаў і імкненняў хлопчыка робяць Івана Патапавіча тым незаменным настаўнікам, якому дзеці давяраюцца поўнасцю. Захоўваючы ўзроставую «субардынацыю», Іван Патапавіч умее быць то шчырым субяседнікам Паўліка (гаворка пра зязюлю, пра вавёрку), то як бы яго дядумцам (паход ва ўрочышчы Горка Першая і Горка Другая), то, як у эпізодзе з сівааронкай, ён можа разам з хлопчыкам, як роўны з роўным, шукаць ісціну.

«Неадкрыты востраў» — гэта цыкл кароткіх апавяданняў, звязаных між сабой аднымі героямі, месцам дзеяння і сур'ёзным, любоўным стаўленнем да лесу і да жыцця яго шматлікіх насельнікаў. Паўлік (а разам з ім і малы чытач кніжкі стараецца пазнаць гэтае жыццё. Пазнаючы яго, ён робіць першыя для сябе адкрыцці, пачынае разумець, што такое дабро і зло, крыўда і справядлівасць. І ў гэтым, перш за ўсё, карысць кніжкі А. Марціновіча, напісанай, дарэчы, ашчадна, немнагаслоўна, займальна і паэтычна.

І шкада, што аўтар часам нібы не давярае малому чытачу, пачынае «разжоўваць» тое, над чым той павінен падумаць сам, разабрацца. Асабліва гэта адчуваецца ў цікава задуманым апавяданні «КВЖ, КМР, ККР» (Каралеўства Вялікага Жэраха, Каралеўства Марнай Работы, Каралеўства Карыснай Работы).

А. МАЙСЕЙЧЫК.
г. Брэст.

А. Марціновіч. «Неадкрыты востраў». Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1966.

У СВАІМ СЯДЛЕ

«Распрэжаны пегас» Георгія Юрчанкі — першая кніжка маладога сатырыка і першы зборнік «Бібліятэкі «Вожыка», які складзены выключна з літаратурных пародый і эпіграм, і таму хацелася б звярнуць на яго ўвагу чытачоў.

Адкрываецца зборнік пародыяй на астрэйкаўскага дзеда Міхеда. Ужо яна пераконвае, што аўтар надрэнна валодае пяром парадыста і што гумар яго па-сяброўску шчыры і добразычлівы, хоць, разам з тым, калючы і часам нават уедлівы.

У Г. Юрчанкі — добрае пачуццё парадыста. У моры літаратурных з'яў ён умее вылавіць і паказаць чытачам якраз тое, што само, здаецца, просіцца «на пяро».

Удала і тонка перададзены манера і стыль Р. Барадуліна ў пародыі «Кулінін сын» — адной з лепшых у зборніку. І нават калі б ёй не папярэднічалі радкі паэта, усё роўна можна было б пазнаць, што гэта — пра Р. Барадуліна.

Г. Юрчанка не ганяецца за знешнімі «смешнымі» прыкметамі ці словамі парадзіруемых паэтаў, не паказвае ім пальцам на недахопы ці пралікі. Ён толькі нібы «дапрацоўвае» аўтара, аднак ужо сродкамі гіпербалізацыі. Пры гэтым парадыст, на маю думку, не пераходзіць мяжы, на якой канчаецца гумар і пачынаецца здзек, абраза.

І ўсё ж, чытаючы зборнік, асалоду дасціпнага слова адчуваеш не заўсёды. Ён няроўны. Удача да Г. Юрчанкі прыходзіць там, дзе строгая патрабавальнасць да сябе спалучаецца з глыбокім пранікненнем у лабараторыю таго ці іншага пісьменніка, у псіхалогію яго творчага працэсу. Знікла адчуванне глыбіні, характэрных асаблівасцей почырку пісьменніка — і няма пародыі.

Вось, напрыклад, пародыя «Кажушок» — на С. Грахоўскага. Гэта, мне здаецца, гумар без адрасу. Апусці прозвішча паэта — і пародыю можна адрасаваць каму хочаш. Крыху наіўнай здаецца пародыя на Ул. Нядзведскага і зусім няўдалай — на В. Вітку («Парыж»). Апошняя перагружана французскімі словамі, не даканца вытрыманы ў ёй вершаваны радок.

Удаліся Г. Юрчанку эпіграмы. Думка кожнай з іх выказана дакладна, ясна, лаканічна. Для прыкладу прывяду адну з іх — «Саўтарам»:

Не бяда, што пішуць разам.
Кожны бачыць, што ў іх
Думкі ёсць.
Але, тым часам,
Малавата на дваіх.

Парадыст у сваёй невялікай кніжачцы расказаў пра многіх паэтаў і празаікаў. Кніжачка «Распрэжаны пегас» пазнаёміла нас і з самім парадыстам, і з яго творчасцю. Скажу шчыра: знаёмства гэтае цікавае і радаснае.

У. ЕРАМІНОК,
настаўнік.
Лунінецкі раён.

Г. Юрчанка. «Распрэжаны пегас». «Бібліятэка Вожыка». Мінск. 1965.

ЖЫЦЦЁ, ЯК ЛЕГЕНДА

Незадоўга да святкавання 20-годдзя Перамогі над гітлераўскай Германіяй Беларускае тэлебачанне пазнаёміла гледачоў з мужным чалавекам, былой партызанскай разведчыцай Надзеяй Аляксандраўнай Багданавай. Усхваляваны расказ Надзеі Аляксандраўны надоўга застаўся ў маёй памяці, пэўна, як і ў памяці многіх іншых людзей. І таму кожнаму, хто глядзеў перадачу, хацелася даведацца як мага больш пра жыццё юнай партызанскай разведчыцы. Такую магчымасць дало чытачам выдавецтва «Беларусь», якое выпусціла сёлета кніжку журналіста М. Андрушчанкі «Легенда пра мужнасць».

Аўтар гаворыць пра баявыя справы юнай партызанкі, пра тое, як яна з таварышам вывешвала чырвоныя сцягі ў акупіраваным Віцебску, як мужна трымала сябе на допытах у фашысцкіх засценках і не здрыганулася перад руляю варожага аўтамата. Суровыя выпрабаванні загартавалі волю Надзі Багданавай, не пагасілі вялікай любві да людзей, веры ў іх. І пасля вайны, вярнуўшыся да мірнага жыцця, яна засталася такой жа: сумленнай, мужнай, сардэчнай. Як і ў гады ліхалецця, яна верна служыць людзям, аддаючы ім цяпло свайго мужнага сэрца. Захварэла Таццяна Самакалёва, тая Самакалёва, якая некалі выхадзіла Багданаву пасля звярскіх катаванняў фашыстаў, і Надзея Аляксандраўна забрала яе дачак да сябе, у сваю сям'ю. Як маці, памагала яна рабочаму Альберту Казлову знайсці правільную дарогу ў жыцці. Такіх прыкладаў у біяграфіі Надзеі Аляксандраўны Багданавай шмат.

Журналіст Мікалай Андрушчанка расказаў пра чалавека, чыё жыццё, мужнасць, вернасць народу і Радзіме вартыя пераймання.

М. САЛАЎЁЎ,
рабочы.

М. Андрушчанка. «Легенда пра мужнасць». На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1966.
г. Салігорск.

Ды пранесці ж як? — Не жарты!
Скрозь была ў тым храме варта!
Захаваўшыся ў пацёмку
і разрэзаўшы галёнку,
пад сваёю скурай ласнай
я зашыў здабытак ясны.
І прайшоў, пранёс ля варты,
хоць было і страшнавата!
Адышоўшыся далёка,
азірнуўшыся навокал,
я адшыў яго з галёнкі,
завінуў хусцінкай тонкай.
З ім пайшоў хутчэй дадому
я сцяжынначкай знаёмай.
Пільнаваўся небяспекі
ад звяроў, ад чалавека,
а пустэльнае бязводдзе
мне страшней было, чым злодзей.
Быў без хлеба, быў у сцюжы,
напакутаваўся дужа,
але хітрасцю і спрытам
дар цудоўны ўсё ж здабыты!
Не чакай братоў дарэмна.
Ні адзін з іх, — я ў тым пэўны! —
не прысніць аб гэткім цудзе,
а здабыць — і не здабудзе.
Мне аддай усё адразу!
— Не, сынок, цвярдзей алмазу
слова наша быць павінна...
Да прызначанай часіны
пачакаем мы прыходу
ўсіх братоў тваіх з паходу!

3

На палудзень сонца стала.
Разгуляўся дзень памалу.
Па гасцінцы, па шырокім
брат другі павольным крокам
набліжаецца, нібыта
ў кайстры сто пудоў закрыта.
Павітаўся. Стаўшы ў хаце,
даставаць пачаў багацце.
Сыпле золата ён жменяй
з кайстры, з пазухі, з кішэні.
Адсюль, з пад кожнай латы
сыпле золата ля таты.
І насыпаў — дух займае!
А цана ж яму якая?!—
Самацвет, ляжаўшы абоку,
сціплым стаў зусім для вока.
Стол ад гэтага багацця
пачынае угінацца.
Паглядзеў стары маўкліва.
Потым кажа:
— Праўда, дзіва!
За сваё жыццё даўгое
бачу першы раз такое.
Раскажы, сынок, адкрыта,
як яно табой здабыта?
— Пераходзячы няспынна
ад краіны да краіны,
да дванаццатай дайшоў я.
Ды ў якое безгалоўе! —
На кані быў,
пад канём быў,
салаўём пеў
і ваўком выў, —
ды таго не бачыў вокам,
што у тым краі далёкім.
Цараваў там кат пракляты,
нават горшы сам за ката.
Ён душыў народу многа
у вастрогах, без астрогаў.
Апрача таго, ля шляху
безліч шыбельніц для страху
праз усю краіну стала...
Гора я заснаў нямала.
А пасля пайшоў да ката,
стаў лізаць яму я пяты,
памагаць душыць народ той
я пачаў, як катаў рота.
Забіраў дабро забітых
сам тыран зусім адкрыта.
Ды і я наўчыўся добра
частку браць сабе у торбу.
Як набраўся, колькі змогі,
дык давай хутчэй у ногі...
А далей куды? — Вядома!
Анікуды больш — дадому!
Бачыш сам — цяжар вялікі,
а ішоў я борам дзікім,
і пустэльняй, і балотам...
Ды чаго мне не было там!
На стале цяпер багацце
у маёй, у роднай хаце!
Перабыўшы ўсе напасці
даць яно павінна шчасце.
Калі думаў брат старэйшы,
што ягоны дар найлепшы,
дык скажу: за ўсё, што маю,
два такіх я атрымаю!
Без ніякага сумнення
меншы брат дастане меней.
Ён рахманы вельмі хлопец,
больш аддасць, чым сам дзе схопіць,
не прысніць аб гэткім цудзе,
а здабыць — і не здабудзе.
Мне аддай усё адразу!
— Не, сынок! — Цвярдзей алмазу
слова наша быць павінна...
Да прызначанай часіны
пачакаем мы прыходу
брата меншага з паходу!

4

Брат сярэдні і старэйшы
селі, крыху спахмурнеўшы.
Паабедалі, паспалі,
перад вечарам усталі,
а малодшага — няма ўсё,
хоць ужо і дзень канчаўся.
— Што ж далей чакаць дарэмна?
З нас дваіх адзін, напэўна,
ўсю сядзібу атрымае.
Хто ж на гэта права мае?
Ты скажы цяпер адразу!
— Не, сынкі, цвярдзей алмазу
слова наша быць павінна.
Да прызначанай часіны
пачакаем мы прыходу
брата меншага з паходу.

5

Дзень схіляўся ў задуменні.
Папаўзлі ў даліны цені.
Каля дрэў высокіх так жа
цень на ценю хутка ляжа.
Сонца стала над ракою.
Захад—хоць дастань рукою.
А старэйшыя братове
ўжо стаяць напагатове,
пазіраюць толькі скоса:
«Ды калі ж пацягнем лёсы?!»
Але вось малодшы брат іх
падаспеў да самай раты.
Прывітаў, прайшоўшы браму,
бацьку і братоў таксама.
Ані кайстры, ні тарбінкі,
толькі дудачка з трысцінкі.
Да ўсяго ж яшчэ і босы,
ў тырсе ўвесь, перапялёсы.
У яго спытаўся тата:
— Што ж прынёс ты, сыне, ў хату?
Шчыра мне скажы, адкрыта,
што табой і як здабыта?
— Ах, татулечка мой мілы!
Я з усёй стараўся сілы
адшукаць такое месца,
дзе народу лепш жывецца.
Трапіў так у край якісьці,
скуль не мог ніяк я выйсці,
бо мне вельмі стала шкода,
што людзей гняце нягода.
Я рабіў там, колькі змогі,
для сірот, для ўсіх убогіх.
Павывучаваў рамёствам
там вялікае я мноства,
з майстраў майстрам стаў не горшым.
Ды не мелі людзі грошай,
каб аддзякаваць за тое,
што рабіў сваёй рукою.
Меў я хлеб і меў да хлеба,
меў грашак я на патрэбу.
І запасу меў я крыху.
Жыць пачаў бадай без ліха.
Час прыйшоў калі вяртацца —
многа меў падзяк за працу.
З тым пайшоў я да радзімы
шчырым словам праведзімы.
У дарозе быць — не жарты.
Гаварыць пра ўсё не варта.
Але вось ля бліжняй вёскі
ўчуў я гвалту адгалоскі.
Як наблізіўся, пабачыў,
што ўдава з малымі плача:
ў іх яшчэ кароўка пала.
пахавалі бацьку. Мала! —
Без кармільца, без каровы
самі ў дол пайсці гатовы.
Што рабіць?! — Мой родны тата!
Я да іх зайшоўся ў хату...
Свой здабытак, адным словам
даў увесь ім на карову.
Удаву паслаў на торг я,
сам таго-сяго нашморгаў,
перакрыў страху на хаце,
перашыў-палатаў плацце,
дзверы ім у хаце справіў,
бо развал у кожнай справе.
Ды і дроў жа ні палена,
накасіць жа трэба сена...
Калі ўсё было гатова,
удава прыйшла з каровай...
Развітаўся з імі... потым
сыну большаму даў боты...
Хоць і пуста у кішэні,
маю ў сэрцы здавальненне...
Гэтай самаю хвілінай
сонца стала над далінай
і сваёй апошняй сілай
на хлапца і пасвяціла.
Калі бляск вячэрні сонца
апавіў плячо у хлопца,
нібы зоркі-самацветы
на плячы зайльснелі гэтым
ці небясныя вясёлкі
па-над ім распялі столкі...
Задзівіўся бацька надта,
глянуў скоса брат на брата.
Паглядзеўшы так маўкліва,
бацька кажа:
— Што за дзіва?
За сваё жыццё даўгое,
бачу першы раз такое.
Раскажы, сынок, адкрыта,
як яно табой здабыта?
Меншы сын смяецца:
— Тата!
Гэта — з беднай хаты плата
за маю ўсю дапамогу.
Выпраўляючы ў дарогу,
абняла ўдава рукою
і удзячнаю слязою
арасіла так плячо мне.
На яго ж і сонца промні
дадалі свайго зіхцення.
Гэта —
сонцава праменне....

6

Бацька змоўк. Падумаў крыху.
А пасля пачаў паціху.
— Што ж скажу, мае вы дзеці!
Пабывалі ўсе вы ў свеце...
Большы—краў, сярэдні—вешаў.
Хто з іх горшы, хто падлейшы?!
Іхні скарб — крывёй абліты
і людской слязой спавіты.
Ці драпежніку ці кату —
будзе роўная адплата...
Ты, мой сын малодшы самы,
на душы не маеш плямы.
Над табой няма праклёну, —
ПРАЦАЙ ты благаславёны!
Зарабіў ты добрай справай
мець і спадчыну па праву.
Вось чаму усё, што маю,
я табе і даручаю...
1966

ЭСТАМП—ВОІНАМ

У салдацкім клубе Н-скай часці Беларускай ваеннай акругі адкрылася выстаўка эстампа мастакоў РСФСР, арганізаваная дырэкцыяй мастацкіх выставак Мастацкага фонду РСФСР і Цэнтральным Домам Савецкай Арміі імя М. В. Фрунзе. Па рашэнню Саюза мастакоў Расійскай Федэрацыі і Галоўнага палітычнага ўпраўлення Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту выстаўка будзе экспанавацца ў войсках Беларускай акругі на працягу года.

На выстаўцы экспануюцца творы разнастайнай тэматыкі, выкананыя ў асноўным за апошнія гады.

Цікавыя ў экспазіцыі работы, прысвечаныя Ул. І. Леніну. Вось, напрыклад, ліст народнага мастака СССР М. Жукава «Ленін-гімназіст». У вобразе юнага Ільіча мастак раскрывае рысы ленінскага характару.

Аматарам мастацтва добра знаёма творчасць графіка А. Ермалаева, яні часта звяртаецца да гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы. Асаблівую папулярнасць яму прынесла графічная серыя «Прэсня. 1905 год». На выстаўцы паказаны два лісты з гэтай серыі: «Барыкады» і «Забастоўка».

Шэраг работ прысвечаны барацьбе савецкага народа супраць чужаземных захопнікаў, жыццю нашых воінаў у мірныя гады. Хочацца адзначыць серыю ленінградскага мастака Ю. Няпрынцава «У дні блакады». Галоўны змест гэтай серыі—непахісная воля народа да перамогі. «На варце міру» —тэма ліста мастака Ф. Успенні.

Шмат твораў на тэмы сённяшняга жыцця краіны. «У забоі» і «Пракат»—лісты вядомага ленінградскага графіка В. Ветрагонскага. Яны перадаюць напружанне працы, валявое намаганне рабочага чалавека. Героі лістоў В. Ветрагонскага — гаспадары магутнай тэхніні, якія валодаюць глыбокімі ведамі, багатым вопытам.

На выстаўцы ёсць і творы аб савецкіх рыбаках («На падыходзе да базы», «Раніца пасля рамонту», «Рыбакі» В. Фаміна), і аб людзях савецкага спорту («Старт», «На Малой Неўцы» А. Ланіна), і маскоўскія пейзажы песняра сталіцы нашай Радзімы народнага мастака РСФСР Ю. Піменава. Вось, напрыклад, ліст апошняга — «Масква. Дажджлівы дзень». Хоць мы не бачым твараў прахожых, якія спяшаюцца, мы адчуваем іх настрой па тым, як убачыў і перадаў мастак бліскучую ад дажджу вуліцу, парасоны, сам рытм руху.

Апрача партрэтаў, пейзажаў, тэматычных кампазіцый, на выстаўцы многа нацюрмортаў, выкананых з густам, майстэрствам.

Воіны Беларускай ваеннай акругі атрымалі цудоўны падарунак ад мастакоў—выстаўка, бясспрэчна, паспрыяе іх духоўнаму ўзбагачэнню, развіццю эстэтычных густаў.

Я. МАЛЫ.

ФОТАВЫСТАЎКА МІНЧАН У КІЕВЕ

У сталіцы братняй Украіны — Кіеве нядаўна адкрылася выстаўка лепшых работ фотааматараў Мінска. Экспануецца 300 здымкаў, розных па жанру, па манеры выканання.

Прыцягваюць да сябе ўвагу наведвальнікаў здымкі «Як быць?» і «Зрэзалася» В. Бархатавай, рэпартажныя партрэты кампазітараў М. Аладава, Л. Абеліёвіча, Я. Глебава, выкананыя Б. Райскім, «Брэсцкая крэпасць» і «Святочны вечар» М. Моніча, «Салігорцы» В. Няхайчыка і многія іншыя.

Як піша газета «Культура і жыццё», фотавыстаўка карыстаецца поспехам у кіяўлян.

Гарачы дзень. Фота С. ГОЛЬДБЕРГА.

ІМЯ, ВАРТАЕ ПАМЯЦІ

Ядвіга Машынская-Гельтман.

У гісторыі беларускай літаратуры і культуры ёсць шмат напаўзабытых, а то і зусім забытых імёнаў. Сённяшняму чытачу, бадай, нічога не гаворыць, напрыклад, імя Ядвігі Машынскай-Гельтман. А між тым імя яе добра вядома тым, хто ўдзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях 1917 года і ў станаўленні Савецкай улады на тэрыторыі нашай рэспублікі. Дарэчы, 16 ліпеня спаўняецца восемдзесят гадоў з дня нараджэння гэтай грамадскай дзеячкі і рэвалюцыянеркі.

Ядвіга Машынская-Гельтман нарадзілася ў Глуску былога Бабруйскага павета ў польскай сям'і. Закончыўшы Ягелонскі універсітэт у Кракаве, яна нейкі час працавала ў мінскіх гімназіях. У Мінску ж яна стала членам, а потым і адным з кіраўнікоў Польскага сацыялістычнага аб'яднання (у якім быў, дарэчы, і С. Берсан), актыўным супрацоўнікам польскай газеты «Праўда», якая выдавалася ў Мінску ў 1917 годзе. Пасля Кастрычніка Я. Машынская-Гельтман выконвала розныя грамадскія і дзяржаўныя даручэнні. У 1924—1931 гадах яна чытала лекцыі ў Мінскім педагагічным інстытуце і адначасова вяла работу ў Інстытуце беларускай культуры. Незаслужана абвінавачаная ў 1937 годзе, яна цяпер пасмяротна рэабілітавана.

Я. Машынская-Гельтман добра ведала беларускую літаратуру, была асабіста знаёма з многімі нашымі пісьменнікамі і паэтамі. Ёю перакладзены на польскую мову і ў 30-х гадах выдадзены ў Мінску такія творы нашай літаратуры, як «Салавей» Зм. Бядулі, «Над ракой Арэсай» Я. Купалы, «Дрыгва» Я. Коласа. У 1936 годзе на старонках польскага часопіса «Культура мас», які выдаваўся ў Маскве, былі надрукаваны перакладзеныя Я. Машынскай-Гельтман урыўкі з паэмы Я. Каласа «Сымон-музыка» і яго ж верш «Да старой вёскі».

Я. Машынскай-Гельтман належаць таксама шматлікія арыгінальныя вершы на польскай мове. Ёю ж складзена некалькі падручнікаў для польскіх пачатковых школ на тэрыторыі нашай краіны.

А. МАЛЬДЗІС.

НАВІНЫ КІНО

ФІЛЬМЫ ПРА ІЛЬЧА

«СТАРОНКІ ВЯЛІКАЙ ДРУЖБЫ»

Карціна расказвае пра апошнія сустрэчы Ул. І. Леніна і А. М. Горкага, якія адносяцца да 1917—1921 гадоў. У гэты складаны перыяд развіцця пралетарскай рэвалюцыі партыя і Ул. І. Ленін праявілі шмат увагі і клопатаў аб Горкім, каб яго дзейнасць была найбольш карыснай справе рэвалюцыі.

Часовыя заблуджэнні Горкага, няправільныя вывады, якія ён рабіў на гэтым этапе творчасці, выклікалі шчырую і сяброўскую крытыку Ул. І. Леніна, што дало пісьменніку падставу ахарактарызаваць адосіны да яго Леніна як «адносіны строгага настаўніка і добрага, клапатлівага сябра».

Вытворчасць Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — В. Максімава, А. Шумскі, рэжысёр — В. Маргенштэрн.

«ВЕЧНАЕ СВЯТЛО»

Усё жыццё Ленін быў неразлучны з кнігаю. Вечнае святло чалавечай думкі адкрываў ён на старонках тысяч і тысяч кніг. Ільіч арыентаваўся ў гэтым кніжным моры свабодна і ўпэўнена. Ён мог бы з поўным правам паўтарыць словы Маркса: «Кнігі — мае рабы».

Фільм прысвечаны вельмі складанай і важнай тэме — ролі кнігі ў фарміраванні асобы Ул. І. Леніна як палітычнага дзеяча і тэарэтыка марксізма, а таксама метаду, стылю работы Леніна над кнігаю.

Вытворчасць Маскоўскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — А. Шубінскі, рэжысёр — В. Маргенштэрн.

«УЛАДЗІМІР УЛЬЯНАЎ»

У фільме расказваецца пра юнацтва Уладзіміра Ільіча Леніна, пра тое, як ён стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы. У карціне паказаны ўдзел Уладзіміра Ульянава ў студэнцкіх хваляваннях у Казанскім універсітэце, першая ссылка ў Какушкіна, удзел у дзейнасці марксісцкіх гурткоў Казані і арганізацыя Самарскага марксісцкага гуртка, а таксама яго першыя выступленні супраць народнікаў. Заканчваецца кінастужка прыездам Ул. І. Леніна ў 1893 годзе ў Пецярбург, калі ён ужо сфарміраваўся як буйны марксіст.

Вытворчасць Ленінградскай кінастудыі навукова-папулярных фільмаў. Аўтар сцэнарыя — Л. Горын, рэжысёр — Б. Валковіч.

«ПРАЗ ГОРЫ ЧАСУ»

Лета тысяча дзевяцсот чатырнаццатага... Галіцыйская зямля. Пра што думаў у гэты сонечны дзень Ул. І. Ленін, гледзячы на горныя вяршыні? Ці не пра тое, што хутка на гэтую зямлю, на гэты ціхі край можа абрынуцца ураган агню і смерці? Ленін і партыя папярэджвалі, што імперыялісты патаемна рыхтуюць вайну.

Але будуць і іншыя войны. Надышоў пярэдадзень сацыяльнай рэвалюцыі. Узнімецца рабочы клас на штурм бастыёнаў капіталізму. Узнімуцца каланіяльныя народы супраць няпрошаных гаспадароў.

Усё гэта будзе! Такія законы гісторыі. Усё гэта бачыў Ленін.

Фільм адлюстроўвае дзейнасць Ул. І. Леніна ў перыяд першай сусветнай вайны з 1914 па 1917 год.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — А. Навагрудскі і С. Бубрык, рэжысёр — С. Бубрык.

«ЛЕНІНСКІ ПЕРШАМАЙ»

Фільм апавядае пра адзін дзень жыцця Ул. І. Леніна — 1 мая 1920 года.

У гэты святочны дзень Уладзімір Ільіч працаваў у Крамлі на Усерасійскім суботніку. Напісаў у газету артыкул пра суботнік. Выступаў з прамовамі на закладцы помнікаў К. Марксу і «Вызваленай працы». Быў на выстаўцы эскізаў помніка «Вызваленай працы». Сказаў прамовы на чатырох мітынгах-канцэртах у рабочых раёнах Масквы. Увечары і позна ўночы працаваў над кнігаю «Дзіцячая хвароба «левізны» ў камунізме». Зрабіў шмат іншых важных дзяржаўных спраў.

Карціна адлюстроўвае гіганцкую, напружаную работу Уладзіміра Ільіча Леніна на працягу аднаго дня.

Вытворчасць Ленінградскай студыі кінахронікі. Аўтар сцэнарыя— А. Пунчонак, рэжысёр — Н. Конанаў.

АДРОДЖАНЫ ШЭДЭЎР АЙВАЗОЎСКАГА

Гэтай карціне суджана было нарадзіцца двойчы — у канцы мінулага стагоддзя пад пэндзлем вялікага рускага марыніста Івана Айвазоўскага і ў 1966-м — у руках вопытных майстроў Украінскай навукова-даследчай мастацка-рэстаўрацыйнай майстэрні. Палатно якое амаль загінула, наклеілі на новае палатно, старанна злучылі берагі разрываў, ачысцілі ад куродыму, замасцікавалі ўчасткі, дзе быў страчаны не толькі жывапіс, але і першапачатковы грунт. Цяжкая і старанная работа працягвалася каля двух гадоў.

І вось твор вярнуўся туды, дзе ён быў створаны, — у Феадосію, у карцінную галерэю Айвазоўскага.

— Карціна «Дэсант у Субашы» была напісана больш чым праз сорак гадоў пасля ўдзелу вялікага марыніста ў дэсантна-марскіх аперацыях ля берагоў Каўказа, што праводзіліся генералам Раеўскім у канцы 30-х гадоў мінулага стагоддзя. Адразу ж пасля вяртання ў Феадосію ў 1839 годзе мастак напісаў пра Субаш дзве карціны. Яны захаваліся. Адна знаходзіцца ў Куйбышаўскім мастацкім музеі, другая — у Ленінградскім ваенна-марскім вучылішчы імя Фрунзе. Але паход пакінуў у Айвазоўскага такія яркія ўражанні, што праз шмат гадоў ён вырашыў прысвяціць яму сваю трэцюю работу. Яна адрозніваецца ад першых дзвюх і па кампазіцыі, і па памеры.

Ад флатыліі баявых караблёў да ўзбярэжжа ідуць шлюпкі. Да месца бою разам з рускімі маракамі накіроўваюцца галоўнакамандуючы Чарнаморскага флоту, адмірал Лазараў і будучыя героі першай Севастопальскай абароны Карнілаў і Нахімаў. На ранейшых карцінах іх не было.

Да Вялікай Айчыннай вайны «Дэсант у Субашы» знаходзіўся ў Севастопальскім Доме афіцэраў флоту. У час другой абароны горада палатно было моцна пашкоджана. З-за адсутнасці дакладных звестак аб прыналежнасці яго Айвазоўскаму карціну спісалі. Пяцьдзесят пяць прабоін налічылі кіеўскія майстры, прыступаючы да рэстаўрацыі шэдэўра. У працэсе прамыўкі яны знайшлі на палатне фрагментарна захаваны надпіс марыніста і вызначылі, што карціна была напісана не ў 70-х, як думалі раней, а ў 80-х гадах XIX стагоддзя.

АДН.

ПАДЗВІГУ ГЕРОЯЎ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Гэта было 14 ліпеня 1944 года. Выконваючы загад Радзімы, група лейтэнанта С. Сухіна пад моцным агнём гітлераўцаў фарсіравала Нёман у раёне вёскі Лунна Мастоўскага раёна і замацавалася на заходнім беразе. Больш сутак сем адважных савецкіх воінаў вялі няроўны бой з ворагам. Яны адбілі 12 атак, знішчылі звыш 150 фашыстаў.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гэтым баі, лейтэнант С. Сухін, сержант С. Калінін, малодшы сержант І. Асінны, радавыя І. Шарамет, М. Майдан, А. Нечыпурэнка і Ц. Салопенка ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Аб усім гэтым расказваюць памятныя стэлы, устаноўленыя ля галоўных дарог, што вядуць у Лунна.

Сесія мясцовага сельскага Савета дэпутатаў працоўных перайменавала цэнтральную плошчу вёскі ў плошчу Герояў.

Тры новыя вуліцы мясцовага калгаса «Расія» носяць імёны А. Нечыпурэнкі, Ц. Салопенкі і М. Майдана, а Лунненская сярэдняя школа — імя І. Шарамета.

На плошчы Герояў калгасы раёна ўстанавілі мемарыял «Героі баёў за вызваленне Лунна». На ім — тэкст Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні сямі савецкім воінам звання Героя Савецкага Саюза, іх партрэты і расказ аб слаўным подзвігу.

Юныя краязнаўцы Лунненскай сярэдняй школы сабралі шмат матэрыялаў пра герояў вызвалення роднай вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і адкрылі ў сваім музеі куток «Баявой славы».

ПАЛАЦ ЗДАРОЎЯ «РЭЧАНЬКА»

У маляўнічай мясцовасці на беразе ракі Шчара ў Дзятлаўскім раёне адкрыўся дом адпачынку калгаса «Слава працы». Ён пабудаваны па тыпавым праекце.

Першым атрымаў пуцёўку ў свой палац здароўя ветэран калгаснай вытворчасці Рыгор Міхайлавіч Дзянісік, імем якога названы новы пасёлак Дзянісаўка. Адпачывае тут і Міхаіл Ільіч Туровіч, адзін з арганізатараў калгаса, а цяпер загадчык рыбнай гаспадаркі арцелі.

У «Рэчаньцы» будуць адпачываць таксама многія працаўнікі палёў і ферм вобласці і рэспублікі.

В. ДЗЯМЕНЦЬЕЎ.

Помнікі нашага краю

Нікольская царква ў Магілёве



Адным з цікавейшых будынкаў барока XVII стагоддзя з'яўляецца Нікольская царква ў Магілёве. Яна была закладзена ў 1669 годзе на водшыбе ад умацаванай асноўнай часткі горада ў прыдняпроўскай пойме, сярод нізкіх будынкаў.

Гэтая царква — крыжова-купалавае збудаванне вышынёю 37 метраў. Галоўны элемент яе кампазіцыі — купал, які вылучае цэнтр будынка і надае яму дынамічнасць.

Цікавы і арыгінальны галоўны фасад царквы. Гэта трох'ярусная сцяна з нішамі, пілястрамі і паўкалонамі, упрыгожанымі раслінным арнаментам. Пластычнае ўзбагачэнне фасадных сцен мы сустракаем і ў беларускіх помніках папярэдніх стагоддзяў. Сюды можна аднесці, напрыклад, храмы XV—XVI стагоддзяў у Сынкавічах і Маламажэйкаве, замак у Міры. Значыць, гэтая асаблівасць дэкаратыўнага аздаблення будынкаў мае свае гістарычныя традыцыі. Ва ўмовах новага стылю барока яна знайшла новае мастацкае ўвасабленне ў выглядзе раслінных арнаментыкі.

Вуглы галоўнага фасада царквы завяршаюцца невялікімі вежамі з купаламі. Гэта доказ таго, што паміж каталіцкімі храмамі і праваслаўнымі беларускімі царквамі з вежамі XVII стагоддзя ёсць некаторае падабенства. Разам з тым архітэктура Нікольскай царквы сведчыць пра самабытнасць майстэрства беларускіх дойлідаў. Яны, адыходзячы ад традыцыйных прыёмаў, выкарысталі ў архітэктурных формах мясцовыя матывы, што вызначыла новае ўспрыняцце кампазіцыі ў стылі барока.

Канструктыўная схема царквы вызначаецца прастатой і выразнасцю. Гэта тры падзеленыя слупамі прасторы (нефы), якія перакрыты скляпеннямі. Сярэдні неф павышаны і асвятляецца верхнімі вокнамі, што стварае ілюзію зальнасці інтэр'ера. Тэма пластычнага вырашэння галоўнага фасада атрымала сваё далейшае развіццё ў інтэр'еры будыніны. Асабліва цікавы і каштоўны ажурны, разны з дрэва іканастас. Ён таксама мае трох'ярусную будову і дэкор, блізкі да галоўнага фасада. Па сваіх мастацкіх якасцях іканастас з'яўляецца вялікай каштоўнасцю і адным з шэдэўраў драўлянай разьбы, якою славіліся беларускія майстры ў XVII—XVIII стагоддзях.

Увогуле як знадворку, так і ў інтэр'еры Нікольская царква—цікавы помнік барока XVII стагоддзя. У ёй сабраны найбольш характэрныя рысы гэтага стылю, а таксама знайшлі адлюстраванне мясцовыя асаблівасці.

Ул. ТРАЦЭЎСКІ, архітэктар.

КАЁЎ ПА ГРАФІКУ

Рыгор ПАДНЕВІЧ

ГУМАРЭСКА

Дамоў вяртаўся я надвячоркам. Суседзяў і знаёмых пазбягаў: зноў вяртаўся ні з чым. Не хацелася сустракацца нават з жонкай, не бачыць таго, як яна глянула б у пустое вядро і спачувальна паківала б галавой, зноў адпраўляючыся глядзець тэлевізар...

Мне пашанцавала: ніхто не трапіўся па дарозе. Жонкі таксама дома не было. Я знайшоў на кухні халодны абед, але не паспеў яго і падагрэць, як пазванілі. Адчыніў. На парозе стаяў сусед.

— Ну, як улоў, Пятровіч? — спытаў ён і адразу ж пашыбаваў на кухню — зірнуць у вядро.

Я паплёўся за ім.

— Так, так, так, — прагаварыў сусед. — Не многія пазайздросцяць... Ну, але ты дужа не перажывай,—падбадзёрыў ён мяне.— Рыба, як кажуць, у рацэ.

— Не ловіцца нешта, — пачаў я апраўдвацца. — Ці можа не ўмею я. Трэці выходны — а нічога не злавіў.

— Так, так, так... Рыбка плавае, кажуць, дзі, па дну..,—сусед запусціў у вядро руку і выцягнуў малюсенькую плотачку. — Стыхійны ты рыбак, Пятровіч. Адсюль і няўдачы.

— Які, які? — не зразумеў я.

— Стыхійны, гэта значыць — не арганізаваны. Працуеш без усялякай сістэмы, — сусед махнуў рукой і, нічога больш не дадаўшы, накіраваўся да дзвярэй.

«Што ён вярзе? Стыхійны, не арганізаваны... А якая патрэбна сістэма, каб злавіць шчупака?»

А сусед неўзабаве зноў заявіўся на маю кухню.

— Вудзіш ты, Пятровіч, — пачаў ён, раскручваючы нейкі скрутак, — без графіка, без плану...

— Графік? План? — горка ўсміхнуўся я.— Як на вытворчасці?

— Прычым тут вытворчасць! Вось глядзі сюды, — сусед, нарэшце, разгарнуў свой скрутак.

«Графік клёву рыбы»,—прачытаў я ўверсе.

— Тут запісана, — пачаў тлумачыць сусед, — дзе і якую рыбу можна злавіць. Захочаш, скажам, ты злавіць язя, — ён правёў пальцам злева направа, пасля зверху ўніз і ўткнуўся пальцам у нейкую кропку. — Тут запісана, што язя можна злавіць у затоках з гліністым дном, у траве на ціхай плыні. Лавіць яго можна на донку, на паплавочную.

Я забыўся на свой абед, хоць кішкі даўно ўжо гралі марш.

— На кручок трэба чапляць белы хлеб, авёс ці гарох. Можна кедравы арэх. Ловіцца язь раніцой, днём, вечарам і нават уначы. З дзвюх гадзін ночы...

— Цікава, цікава...

— А яшчэ тут напісана, што язь лепш ловіцца тады, той парою, калі цвіце каліна.

— Глядзі ты, — разявіў я рот ад здзіўлення. — А не сказана, чаму гэта?

— Дакладна не сказана, — адказаў сусед.— Відаць, эмацыянальнае ўздзеянне фауны на флору... Або, скажам, — працягваў ён, — пойдзеш ты лавіць ментуза. І дарэмна страціш час, бо летам мянтуз..,—сусед тыцнуў пальцам у графік і зірнуў на мяне.

— «Не клюе», — прачытаў я.

— А цяпер давай праверым, чаму ты сёння нічога не злавіў. Чым ты лавіў? Якой нажывай?

— На закіданку. Чапляў хлеб, матыля. Спрабаваў на сляпня. Жыцця ад іх не было. У вочы прама лезлі...

— Дзе лавіў?

— На паваротцы ракі. Высокі, сухі бераг...

— Усё зразумела, — сусед уткнуўся ў свой графік і доўга вадзіў пальцам зверху ўніз і справа налева. — Усё правільна. Закіданкай на хлеб, чарвяка або сляпня ты мог злавіць яльца альбо харыуса. Але ж іх трэба лавіць на плыні, на быстрыні, на перакатах. Так што—даводзіцца канстатаваць, што тое, што не злавіў ты нічога зусім заканамерна...

— Не злавіў заканамерна? — уставіўся я на суседа.

— Менавіта так — заканамерна.

— Але ж іншыя ловяць! Пры мне лавілі!

— Якую рыбу?

— Усякая траплялася.

— Вось, вось, усякая, — узрадавана сказаў ён. — А лавіць трэба тое, што табе падабаецца. Ты, калі ідзеш у магазін, купляеш тое, што табе трэба, а не тое, што ёсць там. То та ж! Памятаеш: «Мы не можам чакаць літасці ад прыроды...» Думаеш, гэты графік пустая забаўка? Як бы не так! Цэлы інстытут працаваў над ім. Кандыдаты, нават дактары навук пацелі, каб скласці яго.

— Няўжо? — не стрымаўся я.

— Няўжо, няўжо!.. А ты паехаў на рыбалку, сеў абы дзе, начапіў абы што і хацеў налавіць добрай рыбы. Рыбак мне знайшоўся!

— Слухай, браток, а ты? Сам як ты? Карыстаешся графікам? Дапамагае ён?

Сусед адразу пасур'ёзнеў, спахмурнеў, памаўчаў, потым прамовіў:

— Я пакуль што вывучаю яго... Ёсць яшчэ карта-план. На ёй абазначаны месцы, дзе якая рыба ловіцца. Хачу дастаць такую карту. Тады ў мяне будзе поўны камплект. Вось тады і паловім...

Некалькі тыдняў я ўжо не езджу на рыбалку. Хаджу па магазінах і знаёмых, шукаю графік клёву рыбы. Ехаць без графіка на рыбалку няварта. Дарэмна толькі час страціш...

«МАШЫННЫЯ» ПРОЗВІШЧЫ

Вось ужо два з палавінаю гады, як дзве магутныя электронна-вылічальныя машыны ствараюць сотні тысяч шведскіх прозвішчаў, якія, калі іх паставіць у адзін рад, працягнуцца на некалькі кіламетраў. Робіцца ўсё гэта дзеля таго, каб ужо ў бліжэйшы час замяніць такія распаўсюджаныя ў Швецыі, так званыя стандартныя прозвішчы, з якіх толькі адныя Андэрсонаў налічваецца 381 тысяча, Юхансонаў — 365 тысяч, Карлсонаў — 333 тысячы і г. д.

Напрыклад, калі вы ў тэлефонным даведніку якога-небудзь вялікага шведскага горада хочаце знайсці Андэрсона ці Петэрсона, ведайце загадзя: ваша праца будзе марная.

Такое мноства аднолькавых прозвішчаў звярнула на сябе ўвагу ўрада. І калі ў Даніі, дзе існуе тая ж праблема, ёсць вельмі шмат кантор па продажу новенькіх, толькі што «спечаных» прозвішчаў, дык у Швецыі іх прапануюць зусім бясплатна.

Досыць часта Шведскае тэлебачанне паказвае сваім гледачам плён працы электронных машын— разнастайнейшыя варыянты нованароджаных прозвішчаў: Аканіус, Акарк, Акбакен, Акбарг, Акберг, Абклад і г. д. За восем гадзін адна такая машына прыдумляе да 900 тысяч слоў; чалавеку ж застаецца «толькі» выбраць, якія з іх самыя мілагучныя і лепш запамінаюцца.

Цяпер у Швецыі створаны спецыяльны караледўскі камітэт, які рэгулярна публікуе ў друку спісы найбольш удалых новаўтварэнняў, спадзеючыся, што незлічоныя Нільсоны і Петэрсоны возьмуць сабе гэтыя — як іх называюць у народзе — «машынныя» прозвішчы. Аднак пераважная большасць насельніцтва Швецыі даволі скептычна глядзіць на ўсю гэтую выдумку, жадаючы, як і раней, называцца так, як называлі сябе іх дзяды і прадзеды.

І. МАСЛАЎ. (ТАСС).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

ТУРИСТ

Штомесячны ілюстраваны часопіс «Турист» выйшаў у свет у студзені 1966 года. Тэматыка яго досыць шырокая і разнастайная, каб зацікавіць аматараў усіх відаў турызму — і тых, хто накіроўваецца ў паход з рукзаком за плячыма, і тых, хто любіць падарожнічаць з усімі выгодамі— на цягніках, цеплаходах, самалётах.

«Турист» павядзе сваіх чытачоў маршрутамі здароўя і ведаў. На яго старонках чытачы знойдуць нарысы і апавяданні, рэпартажы і дарожныя нататкі аб прыгажосці роднай прыроды, аб месцах, звязаных з гераічным мінулым нашага народа, аб сустрэчах на турысцкіх сцежках з цікавымі людзьмі, новыя турысцкія песні.

Чытачы даведаюцца пра новыя турысцкія базы і маршруты, пра тое, як самому зрабіць пёгкі і кампактны турысцкі «дом», і яшчэ пра многае іншае, што цікавіць не толькі вопытных, але і пачынаючых падарожнікаў, краязнаўцаў, аматараў роднай прыроды.

Часопіс афармлены прыгожымі малюнкамі, ілюстрацыямі, каляровымі ўкладкамі. Цана аднаго нумара — 40 кап.

ЦЭНТРАЛЬНАЕ РОЗНІЧНАЕ АГЕНЦТВА «САЮЗДРУК»

ТЭЛЕБАЧАННЕ

15 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Падарункі сяброў «Прыгоды Фэфі». Кінафільм ГДР. Чацвёртая серыя (М). 11.50 — усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. Спявае хор ліпецкіх металургаў (М). 12.20 — «Па роднай краіне» (М). 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. Канцэрт (М). 17.30 — для малышоў. «Пеця-Пеўнік». Мультыплікацыйны фільм. 17.40 — «Лясная казка». Рэпартаж дзяцей у піянерскім лагеры. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — музычны антракт. 18.30 — «Першы крокі». Рэпартаж з Мінскага млынбіната. 19.00 — «Балтыйскае мора павінна стаць зонай міру» (М). 20.00 — «Дзелавыя людзі». Мастацкі фільм. 21.20 — чэмпіянат свету па футболу. Венгрыя—Бразілія. Перадача з Англіі. У перапынку—дзённік першынства свету па фехтаванню (М).

Другая праграма. 17.30 — эканамісты за «Круглым сталом» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — па музеях і выставачных залах. Рэпартаж з Музея народнай Усходу (М). 19.00 — «Лясная быль». Навукова-папулярны фільм. 20.00 — «Я іду закаханая». Лірычны канцэрт (М). 20.30 — Б. Палярыны на кавой. «Канцэрт». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача са Свярдлоўска.

16 ліпеня

Першая праграма. 11.00 — для тых, хто працуе ў другую змену. На чэмпіянаце свету па футболу (М). 14.20 — праграма перадач. 14.25 — для дзяцей. «Пунсовыя ветразі». Мастацкі фільм. 15.50 — спявае С. Крушальніцкая. Перадача з г. Львова. 16.10 — для малышоў. «Машанька і мядзведзь». Мультыплікацыйны фільм. 16.30 — тэлевізійныя навіны. 16.50 — чэмпіянат свету па футболу. СССР—Італія. Перадача з Англіі. У перапынку — тэлевізійныя навіны. 18.45 — тэлевізійныя навіны (М). 19.15 — «На агеньчык» (М). 20.30 — Лопэ дэ Вега. «Сабака на сене». Спектакль Дзяржаўнага новасібірскага драматычнага тэатра «Чырвоны факел». Перадача з г. Горкага. У перапынку—дзённік першынства свету па фехтаванню (М). 23.45 — чэмпіянат свету па футболу. Балгарыя—Партугалія (у запісе) (М).

Другая праграма. 14.30 — для школьнікаў. Л. Гераскіна. «Мяккі характар». Тэлевізійны спектакль (М). 15.50 — для дзяцей. «Карбуда». Мультыплікацыйны фільм. 16.10 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 16.50 — «З песняй па Аўстрыі». Кінанарыс. 17.10 — наш кінаглобус. «Злата Прага». Дакументальны фільм. 18.00 — канцэрт Дзяржаўнага народнага хору імя Пятніцкага. 19.00 — суботні кінаэкран. 20.00 — рэклама, аб'явы. 20.10 — «Гэта здарылася ў міліцыі». Мастацкі фільм.

17 ліпеня

Першая праграма. 9.55 — праграма перадач. 10.00 — «Табе, юнацтва!» (М). 10.45 — для школьнікаў. «Аперацыя «Сірыус 2». Перадача з Ленінграда. 11.30 — першынство свету па мотагонках (М). 12.30 — для школьнікаў. «Дзяцінства Цёмы». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 14.00 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. Вядзе перадачу А. Ракітніцкі. 14.30 — «Лары лесу». Расказвае Сяргей Дубравін. 15.00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Салдат—заўсёды салдат» (М). 16.00 — тэлевізійныя навіны (М). 16.10 — музычны кіёск (М). 16.30 — «Людзі вогненнай прафесіі». Да Дня металурга (М). 17.20 — «Салаўіныя ночы». Літаратурна-музычная перадача. 18.00 — «Святло і цені» (М). 18.30 — клуб кінападарожнікаў (М). 19.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.10 — для юнацтва. «Вечар пяці жаданняў». Перадача з Балгарыі. 20.50 — «Вярніся, Беата!». Мастацкі фільм. Дзецям да 16 год глядзець не дазваляецца. 22.25 — эстрадны канцэрт. 23.10 — на чэмпіянаце свету па футболу (М).

Другая праграма. 17.20 па вашых просьбах. Канцэрт (М). 18.00 — для дзяцей. «Два капітаны». Мастацкі фільм. 19.30 — «Усяго адно жыццё». Дакументальны фільм. 20.00 — «Да новых сустрач. Муслім». Фільм-канцэрт. 20.50 — Б. Лаўранёў. «Гравюра на дрэве». Прэм'ера тэлеспектакля (М). 22.20 — любімыя спевакі. Анна Мафо (М).

Друкарня выдавецтва «Звязда».

Індэкс 63856. АТ 01723